Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЖНІЎНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №148 (28512)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Дэкрэт №3 дапрацуюць**

СТАР. 2



**Карныя аперацыі вачыма сведкі**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br500 млн**

*будзе дадаткова накіравана ў 2017 годзе на выплату пенсій і дапамог. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў №577 ад 1 жніўня. Згаданыя сродкі пойдуць на фінансаванне расходаў на выплату пенсій і дапамог, у тым ліку з улікам забеспячэння суадносін сярэдняга памеру пенсіі па ўзросце і сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне не ніжэй за ўстаноўленае парогавае значэнне паказчыка нацыянальнай бяспекі ў сацыяльнай сферы.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9568 | ▲ |
| Еўра | 2,3169 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0322 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Родам з вогненнай вёскі



Ніна КНЯЗЕВА — жыхарка Быхаўскага раёна. Яе вёску Красніцу называюць сястрой Хатыні. Ніна Міхайлаўна — апошняя сведка крывавай драмы, якая разыгралася 75 гадоў назад, у ліпені 1942 года. Нямецкія карнікі жорстка абышліся з насельніцтвам вёскі — больш за 800 чалавек было забіта альбо згарэла ў агні. Нейкім цудам Ніне было наканавана ацалець, выжыць у тым пекле.

А яшчэ Ніна Міхайлаўна Князева — адна з гераінь кнігі «Я з вогненнай вёскі...» — надзвычай важнага дакумента пра злачынствы нямецкіх катаў на нашай зямлі, які склалі для нас Янка Брыль, Алесь Адамовіч і Уладзімір Калеснік. Мне пашчасціла завітаць у адроджаную Красніцу і пазнаёміцца з Нінай Князевай — адной з найстарэйшых жыхароў вёскі. Звычайны здымак... Але сёння ён даў мне падставу ўспомніць дзве даты — і сумную для Красніцы гадавіну, і стагадовы юбілей народнага пісьменніка Янкі Брыля, які зрабіў так, каб мы не забываліся пра дату першую.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*(Працяг тэмы на 4-й стар.)*

■ Жніво-2017

## ХВІЛІНКА, ЯКАЯ ГОД КОРМІЦЬ

### Уборка сёлетняга ўраджаю ідзе са спазненнем на 10—14 дзён

**Тым не менш прыкладна чвэрць збожжавых і зернебабовых абмалочана на Гомельшчыне на гэты час. І калі ў лідарах сёння Рэчыцкі раён, дзе гаспадаркі ўбралі практычна палову ад пасеянага, то на поўначы вобласці толькі пачалі масава збіраць збожжа. Але ж і тут, гавораць, разлікі на ўраджай зусім не дрэнныя.**

СТАР. 2




**Старшы оперупаўнаважаны групы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі аддзела ўнутраных спраў Чачэрскага райвыканкама Цімафей ШАРШНЁЎ з праверкай сельгастэхнікі на полі ААТ «Звязда».**

■ Нашы дзеці

## Хто спыніць арэлі?

### Як сіроты пераходзілі з рук у рукі

**Нядаўна давялося прысутнічаць на судовым пасяджэнні, дзе вырашалася пытанне аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў. Аказалася, што маці ўжо праходзіла падобную працэдуру, але праз некаторы час змагла адстаяць свае правы і вярнуць сына. Гэтым разам справа датычыла ўжо дваіх дзетак.**

### З РАДЗІЛЬНІ — НА ГАЗОН

Гледзячы на гэтую жанчыну, назавём яе Галіна*, і не паверыш адразу, што яна здольная адмовіцца ад дзяцей. Невысокая, стройная, добра апранутая. Акуратныя светлыя валасы сабраны ў прывабны «хвост», твар без макіяжу. Позірк спакойны, упэўнены. Не скажаш, што яна слабая жанчына. Хутчэй гэта можна аднесці да яе мужа, Васіля*. Перад пасяджэннем суда даведалася, што ён крыху маладзейшы за жонку, ёй споўнілася 40 гадоў. І на судзе паводзіў сябе як чалавек, які сам патрабуе апекі. Цягаўся за Ганнай з такім выглядам, быццам яму ўсё абыякава. Жанчына вяла сябе стрымана і маўклівa.

Акрамя бацькоў на судзе прысутнічала і родная бабуля дзяцей — маці Васіля, і яе сужыцель. У якасці сведак — прадстаўнікі органаў апекі, суседзі, выхавацелі, члены прафілактычнай камісіі, педагогі, прадстаўнікі мясцовай улады, працоўнага калектыву.

Першае ўражанне — нельга ад такой жанчыны дзяцей забіраць. Эмоцыі былі на яе баку і шукалі нагоды за што-небудзь зачапіцца.

Але ад аднаго да другога сведчання выяўлялася драма сям'і, у аснове якой аказалася банальнае п'янства.

...Пачалася гэтая гісторыя амаль тры гады таму, калі ў сям'і Васіля і Галіны нарадзіўся сын Антон*. Але праз два месяцы хлопчыка знайшлі літаральна на газоне ў цэнтры Гродна. У гэты час яго бацькі пілі-гулялі на кватэры сваёй знаёмай, да якой прыехалі з Гродзенскага раёна. Па іх версіі, дзіця выкралі. Міліцыя адправіла знайдыша спачатку ў бальніцу, адтуль хлопчык трапіў у Дом дзіцяці. Пасля доўгага працэсу суд вынес рашэнне пазбавіць бацькоў права выхоўваць дзіця. Васіль і Галіна вырашылі вярнуць сына...

СТАР. 4

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 5 дзён

**На ўсе 100!!!**

**100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна. Заставайцеся з намі – будзе цікава! Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.**

# АДКАЗНАСЦЬ — ЗА МЯСЦОВЫМІ ЎЛАДАМІ

## Якім будзе дапрацаваны Дэкрэт №3

**Існаванне краіны ў будучыні залежыць ад таго, ці будзе існаваць народ, які яе насяляе, ці не знікне ён і не асімілюецца з суседнімі. Існаванне паспяховай краіны сёння напрамую звязана з актыўнасцю, працаздольнасцю яе грамадзян. Тады паўнацэннымі членамі грамадства будуць адчуваць сябе не толькі ўсе дарослыя, якія працуюць, але і пенсіянеры, інваліды, дзеці... Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад, прысвечаны дэмаграфічнай сітуацыі і садзейнічанню занятасці насельніцтва.**

### 15 мільёнаў — рэальнасць?

— Нам трэба абмеркаваць важныя пытанні развіцця нашай дзяржавы, прама скажу — бяспекі Беларусі на будучыню, — адразу акрэсліў маштаб тэмы кіраўнік дзяржавы. — Гэта, перш за ўсё, пытанні дэмаграфіі і занятасці насельніцтва краіны.

Асабліва Прэзідэнт звярнуў увагу на другое пытанне, да яго — у тым ліку ў Палацы Незалежнасці — звяртаюцца не першы раз. Занятасць уваходзіць у тройку найважнейшых для краіны сацыяльных пытанняў — разам з цэнамі і зарплатамі. Рашэнні адпаведных праблем, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, маюць першаступеннае значэнне.

— Стварэнне ўмоў для стымулявання нараджальнасці і забеспячэння людзей работай, росту іх дабрабыту — гэта асноўныя ўрадавыя задачы, задачы мясцовых органаў улады, якія патрэбна вырашаць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — І, безумоўна, рашэнне гэтых сацыяльных пытанняў — патрабаванне вельмі жорсткае да любога чыноўніка. Наша галоўнае багацце — чалавечы капітал. У апошнія гады ў нас была станоўчая дынаміка прыросту насельніцтва, неабходна гэту дынаміку не проста захаваць, яе трэба павялічыць.

Кіраўнік дзяржавы ўжо не раз казаў пра тое, наколькі важны гэты фактар для паспяховага развіцця краіны:

— Я неаднаразова падкрэсліваў: Беларусь можа пракарміць 20 мільёнаў чалавек. А вось найгалоўнейшая наша задача, якую — не мы, дык нашы дзеці павінны вырашыць, — 15 мільёнаў насельніцтва. Гэта эканамічная бяспека нашай краіны, гэта магутнасць нашай дзяржавы. І мы абавязаны дзейнічаць на апераджэнне, прагназаваць будучыя працэсы і своечасова на іх рэагаваць.

### Размовы пра адмену Дэкрэта №3 няма

Кожны, хто хоча працаваць, павінен мець такую магчымасць, заявіў Прэзідэнт. Таму органам улады трэба аказваць дапамогу ўсім, хто мае патрэбу ў гэтым. Актыўна наладжваць перанавучанне грамадзян, садзейнічаць ім у арганізацыі сваёй справы.

Праблемы ж, як правіла, з тымі людзьмі, якія не хочуць нікуды ўладкоўвацца:

— Вось гэтых спадароў трэба прымусіць працаваць. Яны не хочуць працаваць. Толькі размовы пра жаданне працаваць. Таму больш за ўсё трэба акцэнтаваць увагу на тых, хто сёння не працуе і працаваць не хоча, але павінен.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама сітуацыяй на рынку працы. Асобна ён звярнуўся да тэмы Дэкрэта №3.

— Як мне далажылі, ужо завершана падрыхтоўка новай рэдакцыі Дэкрэта №3. Я хацеў бы грунтоўнага даклада на гэту тэму, і ўвогуле гэту праблему хаваць нельга. Калі ў некага ёсць жаданне гэту праблему схаваць — гэта няправільна. Не трэба яе хаваць у дэмаграфію, яшчэ ў нейкія пытанні. Грамадства павінна ведаць, што ніякай адмены Дэкрэта №3 быць не можа.

Як агучыў Прэзідэнт, каля паўмільёна чалавек — працаздольных — у нашай краіне не працуюць.

— З іх 200 тысяч мы можам вызваліць: шматдзетных, хворых, інвалідаў — людзей, якія можа і хочуць працаваць, але ў іх не атрымліваецца — у сілу жыццёвых абставін. Але 300 тысяч дзе? Таму Дэкрэт №3 — гэта 300 тысяч тых, хто павінен працаваць, але не працуе. І мы іх павінны прымусіць працаваць. Хаваць тут ад народа нічога не трэба.

Работа па рэалізацыі гэтага дакумента, калі ён будзе дапрацаваны канчаткова, у першую чаргу будзе на плячах мясцовых органаў улады. Менавіта яны непасрэдна кантралююць рынак працы, ведаюць, чым займаецца кожны чалавек у канкрэтным горадзе, вёсцы.

— Выканаўчыя органы ўлады на месцах павінны мець усе паўнамоцтвы і рычагі ўздзеяння на гэтых людзей для рашэння згаданых праблем, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Вось, што мы павінны зрабіць. І прапісаць у новай рэдакцыі Дэкрэта.

Кіраўнік краіны выказаў спадзяванні, што акрамя ўрада гэтым сур'ёзна зоймуцца дэпутаты:

— Гэта іх хлеб. Я быў дэпутатам і ведаю добра кірункі працы дэпутацкага корпуса. Добры дэпутат у сваёй акрузе ведае ўсіх гультаёў.

Аляксандр Лукашэнка агучыў і тэрмін, да якога дакумент павінен быць гатовы:

— Да першага кастрычніка мы павінны мець гэты дакумент — разам з іншымі па разняволенні бізнесу. У нас ёсць на выхадзе сур'ёзны дакумент, яшчэ шэраг дакументаў — прынцыповых, якія разлічаны на развіццё і станаўленне — не баюся гэтых гучных слоў — нашай дзяржавы. Таму давайце абмяркуем гэтыя пытанні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

**У тэму**

**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны,** па выніках нарады адказала на пытанні журналістаў:

— Дэкрэт №3 не адмяняецца. Пры гэтым урад прапануе новыя падыходы па стымуляванні занятасці насельніцтва. Перш за ўсё акцэнт робіцца на органы выканаўчай улады на месцах.

Другі момант, звязаны з прынцыпам: не працуеш — плаціш за паслугі. Маюцца на ўвазе тыя паслугі, што субсідзіруюцца дзяржавай. Дакладны іх пералік пакуль адпрацоўваецца. Рэалізоўвацца гэты прынцып будзе праз стварэнне сучаснай базы даных, якая ўтрымлівае інфармацыю па кожным грамадзяніне. Стаіць задача па стварэнні беларускай інтэграванай сэрвісна-разліковай сістэмы — ID-карты.

Пры дапамозе гэтай карты праз агульнадзяржаўную аўтаматызаваную сістэму можна будзе адразу ўбачыць: ці працуе сёння чалавек. У той жа час, карта будзе выконваць функцыі нашмат больш шырокія, чым названая.

## ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА — ВАС ВЫСЛУХАЮЦЬ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваецца традыцыйная сувязь. 5 жніўня на прамых лініях у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме, якія штотыдзень праходзяць у суботу з 9.00 да 12.00, на звароты і пытанні грамадзян будуць адказваць:**

- намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч. Тэл. 8 (016) 2213121;
- кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч. Тэл. 8 (021) 2222222;
- першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч. Тэл. 8 (023) 2751237;
- намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна. Тэл. 8 (015) 2735644;
- намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч. Тэл. 8 (022) 2501869;
- старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч. Тэл. 8 (017) 5004160;
- намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч. Тэл. 8 (017) 2224444.

# ХВІЛІНКА, ЯКАЯ ГОД КОРМІЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З **дырэктарам ААТ "Звязда" Чачэрскага раёна Галінай ТРЫБУНАХ** мы выязджаем на поле, дзе поўным ходам ідзе ўборка аўса. У кіроўцаў, якія працуюць на адвозе зерня, літаральна няма хвілінкі на перакур.

— Прастояў у нас няма, — кажа кіраўнік гаспадаркі. — Уборка збожжавых спакон вякоў — гэта асноўны заробак людзей. І яны самі разумеюць, што трэба працаваць з чатырох гадзін раніцы. Гэта такая пара, што адпачываць няма калі. Хаця мы заўсёды кажам: калі стаміліся — лепш перадыхніце гадзіну, а потым працуйце. Праблем тут не будзе, бо вельмі цяжкая праца ў камбайнераў. Сёння ж, калі добрае надвор'е, дарагая кожная хвіліна. Ёй і карыстаемся. Каб болей убраць, намалаціць.

Сёлета ў гаспадарцы пачалі ўбіраць збожжа толькі 27 ліпеня. Хоць летась камбайны на поле выходзілі ўжо трынаццатага. Дажджлівае надвор'е ўнесла свае карэктывы ў тэрміны, але ж перспектывы на ўраджай добрыя, гаворыць Галіна Трыбунах:

— Намалоцім дакладна больш, чым летась. І ўраджайнасць вышэйшая будзе. Цяпер авёс у нас ідзе дзесьці 60 ц/га. Пшаніцы і трыцікале, думаю, не менш за 50 будзе. Жыта яшчэ не пачыналі. Хаця, думаем, ураджайнасць за 40, як і ячмень, будзе. І, заўважце, гэта з улікам бала глебы ў нас толькі 24,8. Я люблю, калі бачыць канчатковы вынік уборачнай пары, калі намалоты пайшлі. Задавальненне такое атрымліваеш, што душа радуецца. Калі надвор'е стаіць добрае — едзеш, любуешся і думаеш: Госпадзі, як добра колас наліваецца! Возьмеш бубачку зерня, глядзіш на яе — якая прыгажосць!

У паспяховай гаспадарцы, якую адзінаццаты год узначальвае член Савета Рэспублікі Галіна Трыбунах, клапоцяцца і пра бяспеку на ўборцы. Галіна Пятроўна пастаянна на сувязі з супрацоўнікамі МНС. Гаворка ідзе аб забяспечанасці сродкамі пажаратушэння. Сельгасугоддзі ўсёй Гомельскай вобласці падзелены на зоны патрулявання. Рэйды штодзень. Правяраецца спраўнасць вогнетушыцеляў, іскрагасільнікаў, уменне механізатараў працаваць бяспечна ў гарачы перыяд.

Сваю справу на жніве робяць і міліцыянеры. За імі замацавана прадухіленне злачынных замахаў на таварна-матэрыяльныя каштоўнасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і крадзяжоў збожжа новага ўраджаю. Менавіта для гэтага супрацоўнікі МУС адпраўляюцца ў рэйды. Правяраюць работу варты ў вячэрні і начны час, кантралююць мэтавае выкарыстанне гаруча-змазачных матэрыялаў.

**Старшы оперупаўнаважаны групы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі аддзела ўнутраных спраў Чачэрскага райвыканкама Цімафей ШАРШНЁЎ** гаворыць, што пастаянна праводзяцца і маніторынгі стану сельскагаспадарчай тэхнікі:

— Глядзім, ці гатовыя сельгасмашыны да работы на полі. Высвятляем факты безгаспадарлівасці. Абследуем месцы захоўвання ўраджаю, выяўляем наяўнасць прычын і ўмоў, якія спрыяюць здзяйсненню правапарушэнняў і крадзяжу. Таксама звяртаем увагу на грузы, якія перавозяцца транспартнымі сродкамі па тэрыторыі раёна, правяраем суправаджальныя дакументы для выключэння выкарыстання фіктыўных бланкаў строгай справаздачнасці.

За гэты год на Чачэршчыне ў сферы абароту таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў парушэнні выяўляліся прыкладна двойчы на месяц. Пры гэтым, гаворыць супрацоўнік міліцыі, па лініі сельскай гаспадаркі, як правіла, парушэнні датычацца перасоўвання буйной рагатай жывёлы, коней, мясной і іншай падобнай прадукцыі:

— Яскравым прыкладам стаў выпадак, калі чачэрскія міліцыянеры затрымалі аўтамабіль з паўпрычэпам, у якім расіянін спрабаваў вывезці 24 кані без неабходных дакументаў. Коні былі канфіскаваны згодна з рашэннем эканамічнага суда Гомельскай вобласці і накіраваны ў даход дзяржавы. Цяпер ідзе расследаванне крымінальнай справы па факце крадзяжу дзвюх кароў у адной з гаспадарак. Іх тры зламыснікі беспаспяхова спрабавалі выкрасці непасрэдна з загона. Яшчэ ў адной гаспадарцы Чачэрскага раёна затрымалі трох мясцовых жыхароў, якія спакусіліся на 12 мяшкоў камбікорму.

Сёлета земляробам Гомельшчыны неабходна ўбраць збожжа на рэкорднай для рэгіёна плошчы ўгоддзяў: больш за 385 тысяч гектараў. Летась было на 35 тысяч менш. На жніве задзейнічана каля 1,3 тысячы камбайнаў, у тым ліку і новая айчынная тэхніка, якая паступіла ў гаспадаркі напярэдадні. Па разліках спецыялістаў, валавы збор збожжа і зернебабовых культур (без кукурузы) у 2017 годзе павінен скласці 1,15 млн т, што больш, чым летась.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША хочуць адмовіцца ад візавай латарэі Green Card

Амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп прапанаваў іміграцыйны законапраект, які прадугледжвае адмову ад візавай латарэі Green Card. Інфармацыя пра гэта была апублікавана ўчора на афіцыйнай старонцы сенатара-рэспубліканца Тома Котана, які з'яўляецца адным з аўтараў дакумента.

У паведамленні адзначана, што існуючая раней сістэма састарэла, яна не адпавядае эканамічным і гуманітарным інтарэсам краіны. Таксама ў заяве гаворыцца, што Злучаныя Штаты Амерыкі хочуць адчыніць дзверы таленавітым людзям з усяго свету, а гэта запатрабуе змяненняў правілаў уезду. У законапраекце агаворваецца ўкараненне сістэмы балаў для імігрантаў. Тыя, хто зможа набраць больш балаў, будуць карыстацца прыярытэтам. На думку аўтараў дакумента, такія людзі змогуць палепшыць амерыканскую эканоміку, дабіўшыся поспехаў у сваёй прафесіі. Ліміт людзей, якіх змогуць прыняць ЗША для пастаяннага пражывання, складзе 50 тысяч у год.

Праграма пад назвай Diversity Visa (вядомая ў нас як Green Card) працуе ў ЗША з 1990 года. Штогод па гэтай праграме від на жыхарства з правам працаўладкавання ў ЗША атрымліваюць 55 тысяч замежнікаў.

### Мадрыд падзяляе занепакоенасць Еўракамісіі з-за наступстваў санкцый ЗША

Іспанія падзяляе занепакоенасць з-за наступстваў, якія новыя амерыканскія санкцыі могуць мець для Еўрасаюза. Пра гэта карэспандэнту ТАСС заявілі ў міністэрстве замежных спраў і супрацоўніцтва краіны.

«Іспанія не дае ацэнак рашэнням, якія прымаюць іншыя краіны, — падкрэслілі ў МЗС. — Аднак мы занепакоены ў сувязі з наступствамі новых санкцый, наступствамі, якія яны могуць мець для эканомікі ЕС». «Трэба больш старанна вывучыць сумесна з партнёрамі па Еўрасаюзе змест і сутнасць гэтых аднабаковых амерыканскіх заходаў», — заключылі ў знешнепалітычным ведамстве каралеўства.

У сераду паведамлялася, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падпісаў законапраект, які прадугледжвае ўзмацненне жорсткасці рэжыму амерыканскіх санкцый у дачыненні да Расіі, Ірана і КНДР. Пазней Трамп раскрытыкаваў падпісаны ім закон, назваўшы яго недасканалым, а шэраг уключаных у яго артыкулаў — неканстытуцыйнымі.

### Імператар Японіі зацвердзіў склад новага кабінета міністраў



Учора імператар Японіі Акіхіта афіцыйна зацвердзіў склад новага ўрада краіны, які яму прадставіў прэм'ер-міністр Сіндза Абэ. Урачыстая цырымонія з гэтай нагоды прайшла ў імператарскім палацы ў Токіа.

Згодна з канстытуцыяй Японіі, імператар павінен зацвердзіць прызначэнне міністраў па прадстаўленні кіраўніка ўрада. Толькі пяцёра міністраў з 19 захавалі свае пасады ў новым складзе японскага кабінета міністраў.

Маштабныя перастаноўкі ва ўрадзе Японіі прайшлі на фоне працяглага падзення рэйтынгу кіруючай ліберальна-дэмакратычнай партыі краіны на чале з прэм'ер-міністрам Сіндза Абэ. Унясенне змяненняў у склад кабінета міністраў Абэ разлічвае спыніць падзенне рэйтынгу і вярнуць давер выбаршчыкаў.

■ Блізкая ўлада

# У ПОШУКУ АДКАЗАЎ І СПРАВЯДЛІВАСЦІ

## Як прайшоў першы прыём грамадзян новым старшынёй Мінскага аблвыканкама

**Адна з галоўных задач Анатоля ІСАЧАНКІ на пасадзе кіраўніка Мінскай вобласці заключаецца ў дапамозе людзям. Першы асабісты прыём грамадзян у новай для сябе ролі старшыня правёў у Барысаўскім раённым выканаўчым камітэце. На сустрэчу запісалася 12 чалавек, і кожная праблема патрабавала дакладнага вывучэння. За ходам шматгадзіннага прыёму прасачыў наш карэспандэнт.**



Перад пачаткам асабістага прыёму грамадзян старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ў Барысаўскім райвыканкаме панавала невялікае хваляванне. Яшчэ б: грамадзяне не часта даходзяць да такога ўзроўню ўлады, каб задаць пытанні, якія іх хвалююць. Гэтым разам большасць праблем людзей была звязана з жыллём і рознага роду будаўніцтвам.

Напрыклад, жыхар вёскі Маісееўшчына папрасіў старшыню дапамагчы з набыццём жылога дома ў аднаго з буйных барысаўскіх прадпрыемстваў. Шмат гадоў таму яму выдзелілі 25 сотак зямлі, на якіх ён узвёў розныя будынкі, каб арганізаваць фермерскую гаспадарку. «Калі я звярнуўся, каб выкупіць зямлю, на прадпрыемстве мне сказалі афармляць зямельны ўчастак і далі дабро на выкуп, — успамінаў мужчына. — Я два гады афармляў гэты ўчастак, пашпарт на дом атрымаў, а потым рашэннем арганізацыі мне было сказана, што раз я 10 гадоў не адпрацаваў на прадпрыемстве, я гэтую зямлю выкупіць не магу».

Анатоль Ісачанка даручыў старанна вывучыць пытанне і пастарацца дапамагчы з выкупам зямлі ў прадпрыемства, аднак толькі ў тым выпадку, калі няма іншых абставін. На яго думку, у падобных выпадках, калі чалавек менш за 10 гадоў адпрацаваў на прадпрыемстве і прэтэндуе на выкуп зямлі, неабходна строгае абгрунтаванне, з якой прычыны прымаецца тое або іншае рашэнне. «Адна справа, калі чалавек год жыў, а потым паехаў у горад, і іншая — калі ўвесь час жыве і працуе на зямлі», — дадаў Анатоль Ісачанка.

Многія пытанні, з якімі звярталіся людзі, маглі б і не паўстаць, калі б грамадзяне старанна вывучалі заканадаўства і звярталіся да спецыялістаў розных ведамстваў. Так, Іван С. прасіў адмяніць рашэнне Барысаўскага райвыканкама аб зносе самавольна збудаваных ім аб'ектаў. Ён атрымаў зямлю, закупляў жывёлу, узвёў будынкі без неабходнай дакументацыі, працаваў тры гады, пасля чаго атрымаў пастанову аб незаконным будаўніцтве.

Як аказалася, на выдзеленай зямлі можна было ўзводзіць часовыя пабудовы, але не капітальныя. Пабудовы Івана зусім не падобныя на часовыя. Акрамя таго, на гэтай зямлі нельга было трымаць жывёлу. «Скажыце, чаму вы ўзводзілі будынак без дазволу, без дакумента?» — такое пытанне паступіла заяўніку ад старшыні аблвыканкама. Падобныя выпадкі, на жаль, нярэдка адбываюцца з-за няўважлівасці саміх людзей, таму заўсёды трэба старанна вывучаць законы.

З даволі незвычайнай праблемай да старшыні звярнулася Інеса Д. Па словах жанчыны, яна атрымала ў спадчыну зямельны ўчастак, на які хацела правесці ваду, газ, зрабіць неабходны рамонт у доме. Але сёння гэта не ўяўляецца магчымым: ва ўчастка нестандартнае размяшчэнне, таму трапіць на яго можна толькі з дапамогай невялікага прахода. Іншымі словамі, да ўчастка няма дарогі. Жанчына папрасіла пашырыць праход хоць бы да 3—3,5 метра, аднак гэта можна зрабіць толькі за кошт тэрыторый суседніх участкаў, але сусед-уласнік на такое не згодны. Адвакат жанчыны, які таксама прысутнічаў на сустрэчы, падкрэсліў, што суседняму ўласніку прапанавалі кампенсаваць частку ўчастка, а таксама выплаціць грошы за страчаныя насаджэнні, але атрымалі цвёрдую адмову. «Чаму не згаджаецца сусед? З-за канфлікту», — прызналася жанчына.

Чаму яна атрымала такі нязручны ўчастак? Аказалася, што першапачаткова ён быў адзіным, аднак потым яго падзялілі, і частку перадалі іншаму чалавеку. З-за канфлікту і негатыўнасці суседзяў дамовіцца надзвычай складана вырашыць гэтае пытанне.

— Праблема заключаецца ў іншым: як толькі мы правядзём ваду і газ, то нельга зверху рабіць дарогу, — адзначыў Анатоль Ісачанка. Старшыня аблвыканкама даручыў разабрацца з незвычайнай сітуацыяй.

На асабістым прыёме грамадзян мела месца і ўсмешка. Тацццяна У. звярнулася да старшыні па пытанні прыватызацыі кватэры і яе газіфікацыі. Правaўстанаўліваючых дакументаў на гэтую кватэру ў яе няма, таму жанчына атрымала час на праведзенне рэгістрацыі. Мясцовы райвыканкам падтрымаў жанчыну, але параіў не прыватызаваць кватэру, паколькі сума прыватызацыі будзе немалой. Акрамя таго, магчыма, у будучыні кватэру прыйдзецца зносіць з-за струхлеласці будынка.

Тацццяна жыве з мужам і дачкой, якія маюць групы па інваліднасці. Старшыня аблвыканкама даручыў прадпрыемству, на балансе якога знаходзіцца дом, правесці газ за два месяцы. Тацццяна не чакала такога хуткага рашэння, таму пакідала прыём са шчаслівай усмешкай.

— Трэба імкнуцца да таго, каб усім было добра. Наколькі гэта рэальна? Жыццё заўсёды ставіць пытанні, — адзначыў Анатоль Ісачанка пасля заканчэння прыёму грамадзян. — Напэўна, сказаць, што ўсё вырашана — гэта не зусім дакладна. Наша задача — вырашаць, каб усім было добра, у любым выпадку і пры разглядзе любога пытання.

На думку старшыні аблвыканкама, пры вывучэнні праблем грамадзян трэба ўлічваць усе інтарэсы, аднак у аснове павінен быць закон.

— Ці адрозніваецца спектр пытанняў грамадзян у Барысаўскім раёне ад іншых рэгіёнаў? Прынцыпова не адрозніваецца. Тыя ж зямельныя пытанні, а таксама праблемы з уводам у эксплуатацыю пабудаваных аб'ектаў, — канстатаваў Анатоль Ісачанка.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Спёка і ападкі

## Затое самы час купацца ў вадаёмах

**Гарачае надвор'е з кароткачасовымі даждамі і навальніцамі чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Самы гарачы дзень гэтага летняга сезона быў 2 жніўня, сярэднясутачная тэмпература паветра перавысіла кліматычную норму на 4—8 градусаў, а днём паветра прагравалася да плюс 29—35. У наступныя дні захаваецца цёплае надвор'е, але без навальнічных дажджоў не абыдзецца.

Прагрэлася вада ў рэках і вадаёмах. Тэмпература вады ў Заходняй Дзвіне складае 20—22 градусы вышэй за нуль, у Нёмане — 22—24, у Дняпры — плюс 22—25, у Сожы і Прыпяці — каля 25 градусаў цяпла, у возеры Нарач — 22, у Заслаўскім і Вілейскім вадасховішчах — 21 градус вышэй за нуль.

У пятніцу, 4 жніўня, пад уплывам чарговай сістэмы атмасферных франтоў, якія зміяшчаюцца з Заходняй Еўропы, ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а днём пераважна па паўднёвым усходзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы, месцамі чакаюцца моцныя лівні і шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 16—22 градусы вышэй за нуль. Днём будзе 24—29 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе чакаецца плюс 30—32.

У суботу, 5 жніўня, надвор'е будзе знаходзіцца пад уплывам няўстойлівых цёплых паветраных мас, у некаторых раёнах не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 градусаў вышэй за нуль, па паўднёвым усходзе — да плюс 20. Днём прагназуецца 22—29 градусаў.

У нядзелю, 6 жніўня, надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі днём па захадзе адаб'ецца ўплыў малаактыўных франтальных падзелаў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. Ноччу будзе без ападкаў, днём у некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—17 градусаў вышэй за нуль. Днём чакаецца 21—28 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 30.

У пачатку наступнага тыдня захаваецца цёплае надвор'е. У панядзелак ноччу пераважна па ўсходзе, днём у некаторых раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—18 градусаў вышэй за нуль, днём будзе плюс 21—28. У аўторак і сераду, 8—9 жніўня, надвор'е будзе фарміраваць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску, на паўднёвым захадзе адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Будзе пераважна без ападкаў, толькі днём па паўднёвым захадзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—18 градусаў вышэй за нуль, днём чакаецца 20—27 цяпла. У сераду па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 28—30.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Стыхія

# Ад падзення дрэва загінула дзяўчынка

## Пашкоджаны лес, паўтысячы населеных пунктаў заставаліся без электрычнасці

**Паводле аператыўных звестак МНС, падчас праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (да 23 м/с) пацярпелі 24 населеныя пункты ў 9 раёнах Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей.**



Пашкоджаны дахі 19 жылых дамоў, трох вытворчых і 28 сельскагаспадарчых будынкаў. Зафіксаваны 14 выпадкаў падзення дрэў, у выніку якіх пашкоджаны пяць легкавых аўтамабіляў. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і ўборцы дрэў.

У 15.13 2 жніўня паступіла паведамленне аб падзенні дрэва на мікрааўтобус (унутры знаходзіліся двое дарослых і пяцёра дзяцей) каля вёскі Кобузі Вілейскага раёна. У выніку падзення дрэва загінула дзяўчынка 2006 года нараджэння.

У 19.30 гэтага ж дня паступіла паведамленне аб пашкоджанні лесу на плошчы 30 гектараў каля вёскі Зайцы Чэрвеньскага раёна. Для ачысткі завалаў задзейнічаны 9 адзінак тэхнікі і 45 работнікаў лясгаса.

Па інфармацыі «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 519 населеных пунктаў, 57 сельскагаспадарчых будынкаў. Адключэнні аператыўна аднаўляліся аварыйнымі брыгадамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# Хочацца, каб было свята

## Мінск другі год запар прымае этап Кубка свету БСБ Банк па мастацкай гімнастыцы

**На пляцоўцы спартыўна-забаўляльнага комплексу Falcon Club выступяць 126 гімнастак з 24 краін, большасць удзельніц ужо ў Беларусі, па невядомых прычынах на турнір не прыехалі спартсменкі з Германіі і Ізраіля. А вось наша зборная будзе выступаць у поўным складзе, краіну прадставяць лідар каманды Кацярына Галкіна, узыходзячая зорка Аліна Гарнасько і тытулаваныя групавічкі — Анастасія Рыбакова, Марыя Кацяк, Ганна Гайдукевіч, Ганна Швайба, Маргарыта Авадзінская і Арына Цыцыліна.**

*— Мы пастараемся, каб сёлета ўсё прайшло так жа цудоўна, як і летась,* — расказвае **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Ірына ЛЯПАРСКАЯ.** — *Прыедуць наймацнейшыя гімнасткі, яны рыхтуюцца да чэмпіянату свету, які пройдзе ў верасні ў італьянскім Пезара, таму гэта адна з апошніх рэпетыцый перад галоўным стартам сезона. Мне б хацелася, каб мінчане прыйшлі падтрымаць нас, пахварэлі за дзяўчат, атрымалі задавальненне і падзялілі з намі гэта свята. А ў канцы мы зробім падарунак у выглядзе гала-канцэрта, які будзе вельмі прыгожы і цікавы.*



Спецыяльна на турнір у Мінск прыляцела **пяціразовая алімпійская чэмпіёнка, пяціразовая чэмпіёнка свету Нэлі КІМ.** Для славутай спартсменкі гэта першы візіт у Беларусь у якасці віцэ-прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі.

*— Я вельмі рада быць тут, хачу павіншаваць беларускую Асацыяцыю гімнастыкі з тым, што вам удалося атрымаць гэты турнір. Кубкі свету набываюць усё большае значэнне і з'яўляюцца другой кваліфікацыяй да Алімпійскіх гульняў,* — сказала ў мінулым вядомая спартсменка.

Арганізатары турніру таксама адзначаюць, што ў Мінск прыедзе чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка, шматразовая чэмпіёнка свету і Еўропы Людміла Турышчава і, магчыма, чатырохразовы алімпійскі чэмпіён Аляксей Немаў.

Этап Кубка свету стартуе 4 жніўня ў 15.00 кваліфікацыяй. Яна працягнецца ў суботу ў такі ж час, і завершацца спаборніцтвы ў нядзелю фіналамі, якія пачнуцца ў 13.00.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# Змяніўся парадак прадастаўлення ДАСД

**Дапаўненні і змяненні ў прадастаўленні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД) прапісаны ў Пастанове Савета Міністраў №576 ад 1 жніўня гэтага года і распаўсюджваюцца на адносіны, якія ўзніклі з 1 ліпеня гэтага года.**

Пастановай прадугледжана, што інваліды III групы і дзеці, якія не прызнаныя інвалідамі, але якія маюць патрэбу ў тэхнічных сродках сацыяльнай рэабілітацыі па медыцынскіх паказаннях, забяспечваюцца такімі сродкамі гэтак жа, як і інваліды I і II групы і дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў. А калі ў чалавека з інваліднасцю змяніліся антрапаметрычныя параметры ці палепшыўся альбо пагоршыўся стан здароўя, будуць выдавацца новыя сродкі рэабілітацыі.

Новай пастановай таксама быў удакладнены пералік даходаў, якія ўключаюцца ў сярэднядушавы даход грамадзян, што прэтэндуюць на атрыманне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі.

У сувязі з тым, што мясцовыя і рэспубліканскі бюджэты на гэты год ужо зацверджаны, фінансаванне расходаў па забеспячэнні дзяцей слыхавымі апаратамі і інвалідаў III групы слыхавымі апаратамі і пратэзамі малочнай залозы з ліфамі сёлета будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, а пачынаючы з наступнага года — за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

Глуша Адамовіча

# З БОЛЕМ АБ РОДНЫМ ПАПЯЛІШЧЫ

## Сведка карных аперацый фашыстаў у Кіраўскім раёне Ніна Іванова дагэтуль жыве пад уплывам тых страшных падзей

**Газета працягвае публікацыю матэрыялаў у падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея Алеся Адамовіча.**
**Учора, 3 жніўня 2017 года, споўніўся 91 год з дня нараджэння пісьменніка. А тая 90-гадовая юбілейная дата, якую мы яшчэ будзем адзначаць 3 верасня, узнікла ў выніку таго, што падчас вайны маці «падмаладзіла» сына, каб яго не пагналі ў Германію. Пазней выратавальная дата стала для пісьменніка пашпартнай.**
**Наогул, тэма вайны для Адамовіча знакавая. І адной з яркіх і моцных па ўздзеянні з'яўляецца аповесць «Карнікі», у аснову якой ляглі жудасныя падзеі вакол вёскі Боркі Кіраўскага раёна. Сённяшняя гераіня публікацыі — адна са сведак той нечалавечай акцыі застрашвання мірнага насельніцтва. Алесь Адамовіч усё жыццё прысвяціў таму, каб праз лёс такіх, як яна, людзей нагадаць пра кволасць гэтага свету і пра тое, як важна захаваць мір. Аповесць стала асновай для фільма «Ідзі і глядзі». Некалькі гадоў таму яна была перавыдадзена ў Англіі і Францыі.**

*...15 чэрвеня 1942 года карнікі штурмбанфюрара СС Аскара Паўля Дырлевангера забілі і спалілі жыхароў беларускай вёскі Боркі Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. У агні загінула больш за 1800 чалавек. Акрамя гэтай вёскі, спецбатальён (адзін са шматлікіх, што дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі) знішчыў яшчэ каля 200 вёсак — больш за 120 тысяч чалавек. У ліку гэтых вёсак і Хатынь...*

Яна з тых, хто сваімі вачыма бачыў увесь гэты жах, але застаўся жывы. Каб расказаць пра трагедыю сваім дзецям, унукам, усім нам. Жанчына да дробязяў памятае падзеі 75-гадовай даўніны. Кажа, можа забыцца пра тое, што з ёй было ўчора, але той дзень гатова аднавіць ледзь не па хвілінах. У 1942-м, калі карнікі спалілі вёску Боркі, ёй было 10 гадоў...

— Да вайны мы жылі ў вёсцы Хонава, да Борак рукой падаць — усяго толькі поле перайсці, — расказвае яна. — У нашай сям'і было шасцёра дзяцей, мы з братам Мішам старэйшыя. Запомнілася, што ў той ракавы дзень нізка над вёскай ляцелі нямецкія самалёты, і іх было шмат. Потым на вуліцы пачалася нейкая трывожная мітусня, людзі беглі, нешта крычалі. Маці выскачыла з хаты: што здарылася? Нехта пракрычаў: гора страшнае, Боркі гараць. Цераз лес з Борак прыбеглі перапалоханыя хлопчык з дзяўчынкай, якія з плачам паведамілі жудасную навіну: «У нас людзей б'юць і двары паляць...»

*...Са сведчанняў былога карніка-дырлевангераўца:*

*«На гэтую аперацыю мы выязджалі з Чачэвіч на аўтамашынах і матацыклах. Прыкладна за тры кіламетры ад вёскі Боркі на шашэйнай дарозе Магілёў—Бабруйск мы прыпыніліся. Паступіла каманда ачапіць цэнтральную вёску і прылеглыя да яе пасёлкі з усходняга і паўночнага бакоў...»*

— Да вайны мой бацька быў брыгадзірам калгаса. Дома ў нас быў конь і ўсё, што да яго прыкладаецца — калёсы, сані. А ў Борках жылі матуліны бацькі. Памятаю, як бабуля Аксіння напярэдадні карнай аперацыі завітала да нас з графінам малака і блінамі. Таты дома не было, і яна папрасіла перадаць, каб ён прыйшоў назаўтра паскародзіць бульбу. Тады яшчэ нічога не прадвяшчала бяды. Але мая маці, напэўна, нешта адчувала. Калі бацька на золаку пачаў збірацца ў Боркі, яна маліла яго не ехаць. Яны нават пасварыліся, але ён яе не паслухаўся. Болей мы жывым яго не бачылі...

*...Са сведчанняў жыхароў «вогненных вёсак»:*

*«Расказаць вам як гэта ўсё пачыналася? Я ячмень жала, а жыта стаяла, і там перабілі 12 душ. А як сталі тых людзей біць, я вось так лягла ніцма і заснула. Я не чула, як іх білі, не чула ані піску таго, ані крыку. А потым, калі ўстала я — вой! — ужо мая хата ўпала, ужо і суседскія. Усё трашчыць, і свінні пішчаць, і ўся скаціна раве. Так я паднялася і стаю, а суседка ідзе і кажа: «Чаго ты тут стаіш? Ці нас жа ўсіх пабілі...»*

— Немцы як раз акружылі вёску, калі тата прыехаў да бабулі. Тут іх усіх і забілі — і дзеда, і бабулю, і бацьку. Маці казала, што яго абгарэлае цела ляжала ля калёсаў. Ужо пасля, калі ўсё сціхла, даросдыя прабраліся ў спаленую вёску, сабралі ў скрыначку ўсё, што засталося ад родных, і пахавалі на сельскіх могілках. Карнікі не шкадавалі нікога, ні дзяцей, ні



Ніна Іванова ў дзявоцтве.

цяжарных, ні старыкоў. Загналі ўсіх у школу, аблілі яе гаручым і падпалілі. Зарава і чорны страшны дым былі бачны здалёк. Разам з жыхарамі былі спаленыя і суседнія пасёлкі — Пралетарый, Чырвоны Араты, Закрыніčча, Доўгае поле, Хватаўка...

*...Во жылі людзі пад дахамі і не ведалі, што самае небяспечнае месца цяпер — свой дах, свае сцены. Тут чалавек, як у пасткі. Дом паказвае, дзе цябе шукаць. Але людзі па звычцы лічаць, што свае сцены дапамагаюць. Хіба што гарэць!..*

— На наступны дзень лёс Борак чакаў і Хонава. Але амаль усе паспелі сысці ў лес. І мы таксама. Маці засталася адна з шасцю дзяцьмі на руках, апошняе як раз толькі нарадзілася. Яна была ў разгубленасці. У нас быў вялікі ўтульны дом, гаспадарка. Шкада было дабро кідаць. Але маці сабрала неабходнае, і мы разам з іншымі рушылі ў лес. Назаўтра ўсіх, хто застаўся ў вёсцы, забілі. А хаты спалілі. Усе да адной. Мы ўсю вайну ў лесе жылі. Немцы туды баяліся сунуцца, міма праязджалі. Партызаны ім часта засады рабілі. Атрад, дарэчы, «Кіравец» называўся.

Як перажылі вайну, не ведаю. Голад быў страшны. У зямлянках ад насякомых не было спасу. Рукі свярбелі ад каросты. Калі немцы адступалі, пакідалі сваіх аўчарак. Яны нападалі на дзяцей і згрызалі іх да костак. Толькі пасля таго, як нашы мужчыны забілі двух сабак, дзеці перасталі знікаць.

*...З хадайніцтваў карнікаў аб памілаванні:*

*...Перад арыштам на маім утрыманні было 8 дзяцей, але ні ім, ні жонцы я не расказваў аб маіх злачынствах, бо расказваць ім пра гэта было жахліва...*



Брат Ніны Івановай Міхаіл і маці.

Памятаю, як пасля вайны нашы салдаты на конях дамоў ехалі. Мы з лесу выскоквалі, рвалі кветкі і на іх кідалі. Як мы рады былі, словамі не перадаць. На жаль, наша родная вёсачка Хонава так і не адрадзілася. Маці дапамаглі пабудаваць невялічкую хатку ў Грыбаўцы, што за кіламетр ад Борак. Так пачалося наша новае жыццё. Ежы не хапала, мы збіралі на полі гнілую бульбу, маці яе чысціла, таўкла ў ступе і пякла аладкі. А яшчэ, каб не памерці з голаду, мы са старэйшым братам хадзілі ў наваколныя вёскі «па міласці». Калі падраслі, маці адправіла нас у Бабруйск у няньки. Працавалі ў асноўным за ежу. Пра тое, каб купіць нешта апрануцца, і размовы не было. Потым знайшла работу на хлебазаводзе, і стала лягчэй. І сама мела магчымасць пад'есці, і сясцёр з маці карміць. А потым выйшла замуж і пераехала жыць у іншы населены пункт. Выхоўвалі з мужам дзяцей, шмат працавалі. Нават медаль ёсць за працоўныя заслугі. Усякае ў маім жыцці было, але нічога страшнейшага за тую трагедыю ў Борках і ўявіць сабе нельга. З тых вёсак, якія спалілі карнікі, яна адзіная была адноўлена пасля вайны. У гонар загінулых жыхароў на месцы трагедыі пабудаваны мемарыял з капліцай. А паабапал яго стаяць званы, як у Хатыні, сваімі жалобнымі гукамі нагадваюць пра нявінных ахвяр. Хаты ў Грыбаўцы, дзе мы жылі пасля вайны, таксама ўжо няма. На тым месцы браты паставілі вялікі валун — на памяць. Калі прыязджаем на могілкі, абавязкова прыходзім туды пастаяць, памаўчаць. Вакол толькі луг і лес шуміць, нібы нашы родныя аб нечым шэпатам размаўляюць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

*У тэксце выкарыстаны ўрыўкі з аповесці Алеся Адамовіча «Карнікі. Радасць нажа або жыццяпіс гіпербарэяў».*

**Фота з архіваў унука Ніны Сцяпанаўны Дзяніса ІВАНОВА.**

***Дабрачынны рахунак для збору сродкаў на рэканструкцыю будынка пад музей Алеся Адамовіча адкрыты пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ «АСБ Беларусбанк», код 760, г. Бабруйск, УНП 701226324. Прызначэнне плацяжу «Для выбару праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Увага! Падача назначэння плацяжу прынцыповая! Гэты доўгі сказ абавязкова павінны быць пазначаны на банкаўскім дакуменце.***

# Хто спыніць арэлі?

## ЗНОЎ У ПРЫТУЛАК

— Узнавіцца ў бацькоўскіх правах няпроста, — адзначыла **старшы памочнік пракурора Гродзенскага раёна Алена ДАЙЛІДА.** — Мала хто можа такі экзамен вытрымаць. У Гродзенскім раёне за апошнія пяць гадоў толькі двойчы вярталі дзяцей біялагічным бацькам, а штогод такіх спраў разглядаецца каля 30.

Малому Антону пашанцавала. Свой другі дзень нараджэння ён сустрэў не толькі з мамай і татам, але і з маленькім брацікам Паўлам*, які нарадзіўся, пакуль Антон быў у Доме дзіцяці. Здавалася б, усё павінна наладзіцца. У Васіля ёсць работа, жонка, сыны. Аб чым клапаціцца, як не аб дзецях?

Аднак не прайшло і года, як малых зноў прыйшлося адправіць у прытулак. Іх забралі на вуліцы, ад бацькоў, якія былі ў нецвярозым стане ў п'янай кампаніі.

— Чаму вы цягаецеся за мужам, замест таго, каб дзяцей даглядаць? — пацікавілася памочнік пракурора ў Галіны.

Аказалася, што Васіль паехаў у Гродна плаціць крэдыт за вокны, а Галіна перажывала, што ён можа грошы прапіць, вось і паехала за ім з дзецьмі. А чаму іх забралі, не памятае. Васіль сказаў, што быў у шокавым стане і нават хацеў сабе вены ўскрыць. Галіна ратавала мужа і забыла пра дзяцей. Толькі праз тыдзень ад бабулі яны даведаліся, што малыя зноў у прытулку.

— Ці прыходзілі вы да іх? — задае пытанне прадстаўнік пракуратуры.

Галіна ў адказ толькі вочы апусціла.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ДЗЕЦІ — АБУЗА?

А між іншым, наведваць дзяцей у прытулку не забаронена, паведамілі ў Гродзенскім доме дзіцяці. Наадварот. Калі бацькі будуць прыходзіць, прыносіць падарункі, прадметы гігіены, праяўляць клопат, то праз паўгода могуць падаць заяву на ўзнаўленне бацькоўскіх правоў.

Трэба сказаць, што Галіну і Васіля спачатку падтрымлівалі — і сельскі Савет, і мясцовыя жыхары. Дапамаглі ўладкавацца на работу ў мясцовую гаспадарку. Камісія па прафілактыцы неадназова адзначала, што яны наладзілі сямейны быт. Тыя, у сваю чаргу, запэўнілі, што змянілі свае адносіны да дзяцей. Васіль закадзіраваўся ад алкагольнай залежнасці. Яны спяшаліся, бо Антон ужо стаяў у спісах на ўсынаўленне.

— Першы раз іх усе падтрымалі, на судзе выступілі за тое, каб ім вярнулі сына. Мы бачылі, што малодшы іх сын дагледжаны, палічылі, што так будзе і надалей. Лаяльна паставіліся, — расказалі ў сельскім Савеце. — Аднак хутка Васіля зноў сталі бачыць п'яным. Кінуў работу.

Мне гэта сітуацыя нагадвае арэлі. З аднаго боку — бацькі, з другога — праваавыя і сацыяльныя службы. Дзеці на іх гойсаюць туды-сюды. Так адбылося з Антонам, які ў свае тры гады некалькі разоў пераходзіў, што называецца, з рук у рукі. І нарэшце, рашэннем суда гэтыя арэлі спынілі. Толькі дзеці аказаліся не з бацькамі, а па іншы бок. Антон зноў атрымаў статус сацыяльнага сіраты. Такі ж лёс напаткаў і яго малодшага брацікa, якому няма яшчэ і двух гадкоў.

## ШАНЦ НА ДЗЯЦІНСТВА

Падчас судовай справы патэлефанавала ў Дом дзіцяці, дзе знаходзіліся хлапчукі. Але выхавацелі не ўтойваюць, што кожнае дзіця праходзіць перыяд адаптацыі. Многія хаваюцца ў сябе, плачуць, крычаць. Стрэсавая сітуацыя не абышла і нашых малых. Патрэбны не адзін месяц, каб яны «адагрэліся».

У Гродзенскім доме дзіцяці знаходзіцца звыш 80-ці дзяцей да трох гадоў. Усе яны альбо адказнікі, альбо адабраны ў нядбайных бацькоў. Вяртаецца ў біялагічную сям'ю працэнтаў дваццаць. Затое ёсць шанц сустрэць новых бацькоў. Па словах выхавацеля, чым раней забяруць у гора-бацькоў дзяцей, тым лягчэй яны прывыкнуць да новай сям'і. Як сведчыць статыстыка, усынаўляюць 50% дзетак. Зараз у Гродзенскім раённым судзе разглядаецца звыш дзесяці спраў па ўсынаўленні.

Цяпер у Антона і яго брацікa іншыя мама і тата. Магчыма, дзеці атрымалі шанц на дзяцінства, якога былі пазбаўлены...

А што з Галінай і Васілём? Каб атрымаць адказ на гэтае пытанне, разам з прадстаўніком сельскага Савета едзем у вёску, дзе яны жывуць. Іх дом бачны здалёк. Гэта двухпавярховы цагляны будынак каля дарогі. Кватэра нядбайных бацькоў на другім паверсе, на першым жыве маці Васіля. Але ні ў першай кватэры, ні ў другой, не адгукнуліся. Кружыла па двары, і мяне не пакідала пачуццё пустаты. Магчыма, ад выгляду дзіцячых цацак, зваленых у кучу каля плота...

***Імёны зменены па этычных меркаваннях.**

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Звязда. Наперад у мінулае. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# Саспелі чарніцы — саспела і жыта



Нішка з ежай для жней і ахвярамі багам поля.

## Час жніва, вяселляў і гульняў

**Нездарма ў беларускай мове апошні месяц лета атрымаў сваю назву. Гэтая пара спрадвек праходзіць у клопатах пра збор ураджаю, яго парадкаванні ў свірнах, у вясёлых забавах. Нярэдкія ў гэты час і вяселлі: сем'ям маладых у жніўні прасцей зладзіць святочны стол і запрасіць як мага больш гасцей, а надвор'е дазваляе бяседзе доўжыцца да самай раніцы.**
**Каманда праекта «Наперад у мінулае» разам з нашым карэспандэнтам вось ужо цэлы год не толькі занатоўваюць народныя песні, што яшчэ захаваліся ў жывым бытаванні, але і прадстаўляюць іх суадносна з каляндарна-абрадавымі традыцыямі пэўнай мясцовасці. І акурат у жніўні мы выходзім на «другое кола»: зноў кіруемся ў вандроўку ў пошуках старадаўніх звычаяў. Гэтым разам завітаем на Піншчыну, у самае сэрца Палесся. Запрашаем гледачоў канала «Беларусь 3» далучацца да нас, бо на працягу месяца раскажам, чым знакавая касавіца ў вёсцы Церабень, як адзначаюць зажынкі ў Ладаражы, што амаль на мяжы з Украінай, і запросім на малацьбу і вяселле ў Сташаны.**

### Фальклорны гурт — з царкоўных пеўчых

Вёску Церабень некалі заснавалі браты Завадскія. Яны набылі тут зямлю і пачалі церабіць лес, гэта значыць высякаць дрэвы, каб здабываць драўніну і вызваляць ворыўную зямлю. Адсюль і назва паселішча. Паступова будавалі дамы, побач сяліліся іншыя сем'і, гадавалі свойскую жывёлу, сеялі збожжа. Яшчэ да вайны ў гэтых мясцінах была распаўсюджаная хутарская форма вядзення гаспадаркі, гаспадары сяліліся ў лесе, на палях каля буйных сенакосаў, а ўжо пасля вайны некаторыя хутары знікалі, а некаторыя разрасліся і з цягам часу аб'ядналіся ў вёску. Спачатку тут было толькі 15 дамоў, а ўжо ў 1960—1970-я гады ў Церабні жыло каля 500 чалавек.

Еўдакія Пашыц шмат гадоў працавала ў мясцовай школе настаўніцай. Але вось ужо выйшла на пенсію, аўдавела, але не змагла ўседзець без любімай арганізатарскай справы. Таму разам з сяброўкамі — пеўчымі ў царкве — два гады таму стварыла фальклорны гурт «Церабяначка». У вёсцы сёння няма Дома культуры, дзе спявачкі маглі б гуртавацца, таму часцей за ўсё сустракаюцца на сядзібе лідаркі калектыву. Адсюль і пачынаюць святочныя абыходы вёскі на Тройцу (тут паводле традыцыі прынята прыбіраць і вадзіць «Куста»), Купалле, Каляды. Еўдакія Антонаўна расказвае, што за досыць непрацяглы час існавання гурта жанчыны «асвоілі» многія традыцыйныя абрады, іх сталі запрашаць на рэгіянальныя святы і фестывалі. На кожным «Церабяначка» прадстаўляе менавіта мясцовыя песні, звычаі.



На касавіцу ў вёсцы прынята збірацца вялікай грамадой. Тут сенакосы вялікія, сіламі адной сям'і цяжка справіцца, таму талака ствараецца досыць хутка, праца ідзе спорна. Дарэчы, майстэрства касіць прадэманструюць не толькі мужчыны, але і жанчыны: за гады ўдоўства многія звыкліся самастойна спраўляцца з гаспадаркай, хоць сёння гэтыя ўменні многім не так і патрэбныя, больш часу бавяць з дзецьмі і ўнукамі ў гарадах. Аднак старадаўнія завядзёнкі ўсё яшчэ жывуць. Жанчыны зазначаюць:

— Калі прыязджаем на балота грэбсці сена, спачатку хрысцімся і просім у бога дапамогі такімі словамі: гасподзь нябесны, сонейка яснае, дапамажы нам на гэтым полі сена ўбраці, каб дажджу не было. Каб паспелі зграбсці і дадому павазіць.



На балота (так тут называюць сенакос) на касавіцу ў вёсцы Церабень збіраюцца ўсёй вёскай.



Натуральна, падчас працы, абеду ў полі (а есці на свежым паветры заўсёды смачней) жанчыны спяваюць. Касавіца тым і прывабная, што строга не рэгламентуе рэпертуару спеваў, таму часцей за ўсё над полем гучаць лірычныя пазаабрадавыя песні — менавіта іх часцей за ўсё просіць душа ўлетку.

### «Калі добрая доля, стань да шлюбу са мною...»

Тут вас прывітаюць хлебам-соллю. Скажуць, што чуткі пра смерць беларускіх вёсак перабольшаныя, бо жыццё тут віруе, а сам невялікі пасёлак поўніцца скарбамі. Самы вялікі скарб, як вядома, — людзі, таму і ў Сташанах вельмі ганарацца сваім народным фальклорным калектывам «Чабатухі». Яны і прыпеўкі паспяваюць, і вяселле зладзяць у адпаведнасці са старажытнымі палескімі традыцыямі, і невялікую тэатралізаваную пастаноўку натхнёна прадставяць, зацягнуць душэўнае: «Ой, калі ж той вечар, дый павечарэ...» і згадаюць сумную песню пра тое, як «падружка мяне з мілым развела».

«Чабатух» часта запрашаюць на вяселлі, таму яны добра ведаюць, як правесці абрад у адпаведнасці з традыцыямі, што існуюць на Палессі спрадвеку. Напрыклад, калі маладую збіраюцца прыбіраць перад шлюбам, спяваюць песню:

*Сіняя ды валошачка каля тыну стаяла,*
*Каля тыну стаяла на вуліцу паглядала.*
*Маладая Манечка тую расу збірала*
*Расою ўмывалася*
*дый да шлюбу сабіралася.*

Ужо прыбраную маладую вядуць да стала, абводзяць яе вакол тры разы пад песню «Брат сястру на пасаг вядзе», дзе ёсць такія словы:



*Дый падай жа мне шубу,*
*бо я еду да шлюбу,*
*Да божага дому. Дай божа долю.*
*Калі добрая доля,*
*стань да шлюбу са мною.*
*Калі я не тая — не станавіся са мною...*

Затым маладых выпраўляюць у царкву на вянчанне, першым павінен ісці жаніх, за ім — нявеста. Звычайна на такое свята збіраецца ўся вёска, таму ў гэты час гучыць песня, што папярэджвае: маладым і ўсёй вясельнай працэсіі на шляху да храма нельга пераходзіць дарогу, бо ў адваротным выпадку шлюб будзе нешчаслівы і працягнецца нядоўга.

**«Рыхтуючыся да жніва, прыбіралі ў хаце, выходзячы на поле, адзявалі чыстае адзенне, бралі з сабою нішку — адмыслова падрыхтаваны фартух ці кавалак тканіны, абрус, куды складалі ежу і абрадавыя рэчы, што неслі на поле».**

Калі вярнуліся з вянчання, амаль адбылася святочная бяседа, усе наеліся і напіліся, прыходзіць час забіраць маладую ў дом жаніха. Тады спяваюць вось такую песню, якую, думаю, многія пазнаюць па больш сучаснай кампазіцыі «Жар-жар», што выконвае этнатрыя «Троіца»:

*Заграбай мамка жар-жар,*
*Будзе-будзе дочкі жаль-жаль.*
*Заграбай мамка попел,*
*Мы ж тваю дочку схопім.*
*Схопім ды ручанькамі,*
*Схопім ды беленькімі.*
*Павязем вараненькімі.*

А вось калі вяселле скончылася, усе ўжо збіраюцца раз'язджацца па дамах, госці могуць учыніць гаспадарам шкоду. Зазвычай нехта з іх таемна выкрадзіць у двор і выпускае з хлява курэй, пеўняў, свіней. У гэты ж час у доме скачуць на лавах, б'юць гаршчок, спяваючы прыпеўкі:

*Мы ж так і не паедзем,*
*Шкоданькі не зрабіўшы,*
*Гаршка не пабіўшы.*

Лічыцца, што лавы трэба паламаць, каб іх больш не маглі выкарыстоўваць у вясельнай бяседзе, а значыць — малады і маладая жылі доўга і разам усё жыццё.

### Уставай раненька ды жні да позненька

На самым поўдні Беларусі, у глыбіні Палесся, амаль на мяжы з Украінай, патанае ў зеляніне вёсачка Ладараж. Тут, у сельскім доме фальклору, ужо многа гадоў існуе калектыў «Ладаражаначка». Жанчыны — старэйшыя і маладзейшыя — часта выступаюць на фэстах у Беларусі і за мяжой, прадстаўляючы аўтэнтычныя абрады і песні рэгіёна. Дарэчы, яны перанятыя ад мясцовых жыхарак, носьбітаў фальклору. Тут складана адрозніць, якая песня беларуская, а якая — перанятая ад суседзяў-украінцаў: суседзі навучылі спяваць па-свойму, і мясцовыя жыхары часта наведваліся ў госці ў суседнія ўкраінскія вёскі, перадавалі ім свае ўменні.

Нам пашанцавала занатаваць адметнасці зажынкавага абраду, што нашы продкі традыцыйна ладзяць перад жнівом. Паводле прыкмет, пачыналі жыта жаць, калі паспявалі ў лесе чарніцы. У гэты час казалі: «Уставай раненька ды жні да позненька». Рыхтуючыся да жніва, прыбіралі ў хаце, выходзячы на поле, адзявалі чыстае адзенне, бралі з сабою нішку — адмыслова падрыхтаваны фартух ці кавалак тканіны, абрус, куды складалі ежу і абрадавыя рэчы, што неслі на поле.



Клалі ў нішку хлеб, загорнуты ў чыстую хустачку, соль, грамнічную свечку, ваду, малако, сала, каўбасу. Грамнічная свечка, хлеб і соль — ахвяра духам поля, нашы продкі верылі, што ў жыце могуць жыць злыя духі, ведзьмы, якіх трэба было задобрыць падарункамі і «загаварыць» адмысловай замовай. Казалі такія словы: «Стань на шэсць ніў, на тысячу кіп, на тысячу міраў, каб добра было нам жаці, дапамажы нам, божа...» Нішку звязвалі адмысловым чынам, як сумку, навешвалі на плячо і неслі на поле.

Калі ўсе вясковай грамадой кіраваліся на жніво, сачылі, каб ніхто не перайшоў дарогу і не сапсаваў працу. Прыйшоўшы на поле, спачатку трэба было павітацца са збожжам і зямлёй, сказаць такія словы: «Добры дзень, ніўка, ядранае жыта, мы да цябе прыйшлі». Перахрысціўшыся, блаславіўшы поле, пачыналі працу.



Першы ўбраны сноп — імяніннік — прынята дарыць гаспадару.

Першыя зжатыя каласкі клалі крыж-накрыж як ахвяру дзеля спорнай працы. А першы сноп — яго ў Ладаражы прынята называць «імяніннікам» — упрыгожвалі кветкамі, стужкамі, перавязвалі ручніком, наміткай ці кавалкам палатна. «Імянінніка» перадавалі на захаванне гаспадару поля. Сноп ставілі на покуці і знаходзіўся там да Прачыстай, што прыпадае на канец жніўня, фактычна да завяршэння жніва. Ды і потым ад «імянінніка» не пазбаўляліся. Яго саломай кармілі свойскую жывёлу, калі яна хварэла, каласкі з яго таксама лічыліся лекавымі. Зерне з «імянінніка» асвячалі ў царкве, ім і засявалі поле на наступны год.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

## Серада, 9 жніўня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з субцітрамі), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 10.05, 22.00 Серыял «След». (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар. (6+).
**11.40, 12.10, 20.00 Серыял «Ветраная жанчына». (16+).**
**13.05 Меладрама «Пляміяшка». (12+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.45, 16.05** «Выратуйце нашу сям'ю». (16+).
**17.35 Серыял «Сямейны ачаг». (16+).**
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Вышук-2». (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.45 Меладрама «Жамчужына палаца». (12+).**
**10.10** «Пра ежу». (12+).
**10.45, 16.05 Серыял «Апошні з Магікян». (16+).**
**11.55, 22.10** «Бітва экстрасэнсаў. 13-ы сезон». (16+).
**14.10, 20.55** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу. (16+).
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.10** «Тата папаў». (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.10** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам. (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Запечаны бурак.
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.35, 20.30, 23.00** «Гэты дзень».
**8.25, 18.55 «Кураж». Драма. (16+).**
**9.15, 15.35 «Балтыйскае неба». Драма. 1-я серыя. (12+).**
**10.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці літаратуразнаўцы Алега Лойкі.
**11.10** «Наперад у мінулае».
**11.35** «Выйсце ёсць». Іван Пінігін.
**12.50 «Па сакрэце ўсяму свету». Прыгоды. (6+).**
**14.50** М/ф. (0+).
**17.00, 21.05** «Вызваленне». Будапешцкая наступальная аперацыя. (12+).
**17.25, 21.30 «Загад: агонь не адкрываць». Драма. (12+).**
**19.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**20.40** «Калыханка». (0+).

### Беларусь 5

**8.00, 20.40** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Вячэрняя сесія.
**10.05** Спорт-кадр.
**10.35** «Хуткасць як прадчуванне». Дак. фільм.
**11.15** Козел пра футбол.
**11.35** Футбол. Суперкубак УЕФА. «Рэал» (Іспанія) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія).
**13.25, 18.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта.
**17.05** Час футбола.
**17.50** Спорт-цэнтр.
**18.55** Баскетбол. Кваліфікацыя да ЧС-2019. Мужчыны. Беларусь — Партугалія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.20** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10, 23.55** «Сам-насам з усімі» (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Каралева гульні» (16+).**
**23.00 Серыял «Лонданград» (16+).**
**0.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.20** «Дарагая перадача» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Усім па катку» (16+).
**11.50, 23.55 «Турысты». Серыял (16+).**
**13.50** «Тэрыторыя памылак» (16+).
**15.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**1.25** «Навечна народжаныя» (16+).

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**6.45** «Мой найлепшы сябар» (12+).
**7.15, 19.20 Серыял «АСА» (16+).**
**10.20** «Любімыя акцёры». Віталь Саломін (12+).
**10.45, 13.15 Маст. фільм «Як тры мушкецёры» (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.55** «Іншы свет» (12+).
**15.00 Серыял «Хатняя работніца» (16+).**
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Пералётныя птушкі» (12+).**
**1.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**5.25** М/ф (0+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.40** «Прамы эфір». (16+).
**17.20 Серыял «Пункты апоры». (16+).**
**19.15, 20.40 Серыял «Тэрмінова ў нумар. На службе закона». (16+).**
**22.00, 23.10 Серыял «Масковская борзая». (12+).**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.10, 8.05 Серыял «Вярнуць на даследаванне». (16+).**
**8.50, 23.05** «НЗ.by».
**9.10, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**11.20, 14.05 Серыял «Масква. Тры вакзалы». (16+).**
**13.30, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.30 Серыял «Ліцейны». (16+).**
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы». (16+).**
**23.25 Серыял «Спроба да ўцёкаў». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Мультпарад». «Дзікія лебедзі» (0+).
**8.00 Серыял «Турысты» (16+).**
**8.50, 16.15 Серыял «Цёмная тэрыторыя» (16+).**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00 Драма «Помста» (18+).**
**13.10, 19.05 Серыял «Кроў і сталь» (16+).**
**15.00, 17.45 Серыял «Маленькая хлусня» (16+).**
**16.00** «Мультпарад».
**18.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Прыгоды «Фліка». (12+).**
**22.55 Серыял «Дзікі Захад» (18 +).**

### ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Вароніны». (12+).
**8.00** «Ералаш». (6+)
**8.30, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.50, 4.40** М/ф «Тры каты». (0+)
**9.10, 5.00** М/ф «Машыны казкі». (0+)
**9.30, 19.00** Серыял «Геймеры». (16+).
**10.30** Фэнтэзі «Ванільнае неба». (16+).
**13.10, 20.00** Серыял «Мамачкі». (16+).
**16.20** Серыял «Закрытая школа-4». (16+).
**17.20, 3.50** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**17.50, 22.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Камедыя «Добры хлопец». (16+).
**0.00** Серыял «Тут хтосьці ёсць...» (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50, 5.10** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).
**2.40** «Лаві момант». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 21.55** «Каломба». Серыял.
**12.50, 19.45** Штучны адбор.
**13.30** «За навуку адказвае Келдыш!» Дак. фільм.
**14.15** Вялікія імёны Вялікага тэатра. Тамара Сіняўская.
**15.10, 21.25** «Тоўстыя».
**15.40** «Стрaдаўнія скарбы М'янмы». Дак. фільм.
**16.30** Пернікавы домік. «Чорным па срэбры».
**17.00, 0.30** «Карціна». Маст. фільм.
**18.20** Сусветныя скарбы.
**18.35** Да 75-годдзя Юрыя Шылера. «Астравы».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**20.30** Прыступкі цывілізацыі. «Загадка вострава Пасхі». Дак. фільм.
**23.45** «Мікалай Федарэнка. Чалавек, які ведаў...» Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Led Zeppelin». 2004 год (18+).
**6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 11.25, 12.40, 14.40, 15.40, 16.55, 18.55, 20.40, 21.40, 22.55, 23.35, 5.10** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Пазнай мяне» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.20** Дак. фільм «Я пашыю вам сукенку» (16+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Ад якіх прынцыпаў мы адмовіліся?» 2007 год (12+).
**13.30, 19.30** Маст. фільм «Міраж» (16+).
**17.10** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Манекеншчыцы і фотамадэлі». 1992 год (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Тацунай Візбар. 2007 год (16+).
**23.15** Праграма «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год (12+).
**0.00** «Акулы пяра». Лада Дэнс. 1998 год (16+).
**0.50** «Чалавек і закон. Спецвыпуск». 1994 год (16+).
**1.05** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе» (18+).
**2.05** «Зямля — Паветра». Пётр Мамонаў. 2003 год (16+).
**3.00** Маст. фільм «Выхаванне жорсткасці ў жанчын і сабак» (16+).
**5.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).

### EuroSport 1

**4.00** Веласпорт (шаша). Чэмпіянат Еўропы.
**5.00, 8.00, 11.00, 14.05, 19.00, 2.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**6.30, 9.30, 15.00, 1.00** Веласпорт. «BinckBank Tour».
**10.30** Ралі. ERC.
**12.00** Алімпійскія гульні. «Дзіўныя моманты».
**12.30** Алімпійскія гульні. «Тэхнічная гонка».
**13.00** Алімпійскія гульні. «On the line».
**18.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**18.30** Футбол. «ФІФА».
**0.20** Watts.

### Кінакамедыя

**0.10** Камедыя «Робін Гуд: мужчыны ў трыко». (12+).
**2.00** Камедыя «Дзюплекс». (12+).
**3.25, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**3.45** Камедыя «Прышэльцы-2: калідоры часу». (12+).
**5.50** Камедыя «Кароль вечарынак». (16+).
**7.30** Камедыя «Ліхтугі Альфрэда». (12+).
**9.10** Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы». (0+).
**10.40** Камедыя «Вялікі тата». (12+).
**12.15** Камедыя «Таткі без шкодных звычак». (16+).
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**16.00** Камедыя «Закаханы і бяззбройны». (16+).
**17.35** Меладрама «Можацца зваць мяне татам». (16+).
**19.30** Камедыя «Аферысты Дзік і Джэйн». (12+).
**21.10** Меладрама «Дапамажыце стаць бацькам». (16+).
**22.50** Камедыя «Дзень выбараў». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.30** «Шафа» (16+).
**8.15** «Доктар І...» (16+).
**8.45, 19.00, 3.05** «Падарунак лёсу». Серыял (16+).
**10.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 4.45** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**17.10** «Шчыра» (12+).
**18.05** «Жанчына ў бядзе». Серыял (12+).
**20.55** «Магазіна» (16+).
**21.55** «Рэвізора» (16+).
**23.00** «Лінія абароны» (16+).
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.15** «Моцны арэшак-4». Баявік (16+).
**2.15** «Жанна, пажані» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Беласнежка: помста гномаў (12+).
**8.30** Каханне жыве тры гады (16+).
**10.30** Акадэмія вампіраў (12+).
**12.45** Мэверык (12+).
**15.30** Шанхайскія рыцары (12+).
**20.10** Целаахоўнік (16+).
**22.40** Моладзь (16+).
**0.40** Параноя (12+).
**2.35** Не здавайся (16+).
**4.05** Зязюне (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Адной левай (12+).
**8.00** Ваўкадаў (16+).
**10.45** Развод па ўласным жаданні (16+).
**12.30** Вострaў загінулых караблёў. 1-я серыя (12+).
**14.05** Крыніца (12+).
**16.05** Край (16+).
**18.30** Мужчына з гарантыяй (16+).
**20.20** Дзень дурня (16+).
**22.20** Клетка (16+).
**0.30** СуперБабровы (12+).
**2.30** Карпаратыў (16+).
**4.20** У стылі jazz (16+).

### National Geographic

**6.00** Папулярная навука. (12+).
**6.45** Код небяспекі. (12+).
**7.10** Зрабі або памры. (12+).
**7.35, 13.20, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55, 10.15, 14.50** Мегазаводы. (12+).
**8.45, 11.00** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.30** Гульні розуму. (12+).
**11.50, 16.25, 19.30, 0.05, 2.25** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**12.35, 18.45, 21.45, 1.40, 4.45** Пачатак. (12+).
**15.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**17.10, 23.20, 3.10** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Дзікі тунец. (12+).
**20.15** Аўта-SOS. (12+).
**22.35** Ліхтугі за мяжой. (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной. (16+).
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Стальныя хлопцы. (16+).
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары. (12+).
**18.00, 1.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**19.00, 2.00** Голыя і напалоханыя. (16+).
**20.00, 2.55** Скарб Купера. (12+).
**4.40** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Тыдзень спрыяльны для зносін з блізкімі сябрамі. У аўторак спатрэбяцца асцярожнасць і ўважлівасць у выкананні любой справы. Паспрабуйце не спатыкнуцца аб дробязі, захаплёшыся звышзадачай. Працы будзе шмат, і яна запатрабуе добрасумленнасці і засяроджанасці. У пятніцу пажадана не пачынаць нічога новага і адкласці важныя сустрэчы на іншы дзень. Перш чым нешта сказаць калегам па працы і блізкім людзям, абдумайце фармулёўку, не факт, што вас зразумеюць правільна.



**ЦЯЛЕЦ.** Перад вамі адкрываюцца бліскучыя перспектывы, але гэта не значыць, што трэба спяшацца. Наадварот, гэты тыдзень запатрабуе скрупулёзнасці і ўвагі, тыя ж, каго энтузіязм прымусіць перасоўвацца выключна бегам, цалкам могуць праскочыць сваю ўдачу без спынення. На вашым шляху практычна не прадбачыцца ніякіх перашкод, акрамя тых, якія створыць ваша няўважлівасць. У аўторак не расказвайце пра свае дасягненні, бо зайздроснікі не дрэмлюць.



**БЛІЗНЯТЫ.** Можаце дамагчыся шмат чаго, калі загадзя вызначыце чарговасць спраў па ступені іх значнасці для вас і не будзеце хапацца за ўсё, што прыходзіць у галаву. Зоркі абяцаюць поспех, прыбытак і ажыццяўленне даўно жаданняў. Прычым дзеля гэтага не давядзецца працаваць з апошніх сіл. Лёс сам дасць вялікія магчымасці. У справах старайцеся кіравацца розумам, не варта прымаць рашэнні выключна таму, што нешта спадабалася ці не спадабалася.



**РАК.** Рэкамендуецца вылучыць з усіх спраў галоўную і з усёй уласцівай вам упартасцю сканцэнтравацца на ёй. Нават самае няпростае пытанне не выстаіць пад вашым напорам. Не прыкладаючы асаблівых намаганняў, зможаце аказацца самыя абаяльнымі і прывабнымі для прадстаўнікоў супрацьлеглага полу. У сярэдзіне тыдня магчыма не зусім прыемная размова з начальствам, але затое зможаце дамагчыся прымальных для сябе матэрыяльных умоў.



**ЛЕЎ.** Паспрабуйце змірыць сваю ганарыстасць, прыслухацца і пачуць патрабаванні кіраўніцтва, і тады справы пойдуць на лад. Важна ўпісвацца ў часавыя рамкі, выключыце спазненні. Ад вас можа спатрэбіцца аператыўнасць у прыняцці рашэнняў. Каб не выдаткаваць занадта шмат сіл і нерваў на супрацьстаянне, старайцеся менш трапляцца на вочы начальству і іншым магчымым апанентам. У чацвер ахоўвайце сябе ад пустых, нікому не патрэбных кантактаў. У суботу магчымыя цікавыя прапановы, на якія варта звярнуць асаблівую ўвагу.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні вы лёгка пераадолееце перашкоды, якія будуць узнікаць. Але для гэтага неабходна займець аднадумцаў, якія маглі б падтрымаць вашы ідэі. Звярніце ўвагу на інфармацыю, яна адкрые для вас новыя магчымасці. Пятніца — той дзень, калі нельга памыляцца, таму што за вамі ўважліва сочаць. Сваю несуцішную энергію лепш выкарыстоўваць у мірных мэтах, не ідзіце на канфлікт.

## ЧАЛАВЕКУ-ТЭРМІНАТАРУ — 70

**30 ліпеня 70-годдзе адзначыў Арнольд Шварцэнэгер — спартсмен, акцёр, палітык, бізнесмен.**



У юнацтве Арні захапіўся новым на той момант відам спорту — бодзібілдынгам, у якім ён дасягнуў неймаверных поспехаў, заваяваўшы тытул «Містар Сусвет». Галівуд не адразу прыняў яго, але ён паказаў фенаменальную здольнасць да навучання і ў выніку стаў адной з самых яркіх і значных зорак за доўгія гады. «Тэрмінатар», «Блізняты», «Апошні кінагерой», «Драпежнік», «Каманда» — гэтыя фільмы любімыя шматлікімі пакаленнямі гледачоў ва ўсім свеце. Гэтай славы, аднак, аказалася мала, і ў 2003 годзе Шварцэнэгер стаў губернатарам штата Каліфорнія. Вяртанне ж у кіно адбылося 10 гадоў таму.

Роля ў культавым баевіку «Тэрмінатар» стала паваротнай у кар'еры Арні. І мала хто ведае, што па задумцы Джэймса Кэмерана першапачаткова ён павінен быў іграць свайго антыпода — Кайла Рыза, каханага Сары Конар. Шварцэнэгер пагадзіўся — у той перыяд яму падабалася іграць герояў. Але ён вельмі хваляваўся, ці будзе дастаткова падрыхтаваны патэнцыйны кандыдат на ролю машыны-злыдня. У рэшце рэшт Арні не адважыўся даверыць гэтую ролю камусьці яшчэ і сыграў яе сам.

У 1960-х усе аўстрыйцы ў 18 гадоў павінны былі адпраўляцца ў войска, каб аддаць радзіме доўг на працягу года. У 1965-м адправіўся ў армію і Арні. Будучы ў вучэбцы, ён збег з часці, каб прыняць удзел у сваім першым бодзібілдарскім конкурсе «Юны Містар Еўропа». Ён заняў першае месца, але па вяртанні адседзеў тыдзень на гаўптвахце.

Зараз Шварцэнэгер, вядома, пастарэў і крыху пагрузнеў. Але ў юнацтве яго цела было не проста прыгожым — яно было дасканалым. Эксперты, трэнеры, культурысты і медыкі — усе згодныя з гэтым. Менавіта таму Арнольд Шварцэнэгер трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса як «самы ідэальна фізічна развіты чалавек у гісторыі планеты».

Працяг горшы за першы фільм, лічаць большасць кінааматараў і сам Шварцэнэгер. Хоць пасля першага паспяховага фільма «Конан-варвар», які сабраў выдатную касу, ён зняўся ў працягу, «Конане-разбуральніку», гэты болыт яму не спадабаўся. І пасля ён рэгулярна адмаўляўся ад любых прапаноў зняцца ў сіквеле. Выключэнне Арні зрабіў за ўсю сваю кар'еру толькі для дзвюх карцін — «Тэрмінатар» і «Нястрымныя».

«Паліцэйскі з дзіцячага садка», дзе Шварцэнэгер іграе копа пад прыкрыццём — адзін з любімых фільмаў суровага Арні. У адным з інтэрв'ю 2015 годзе ён прызнаўся, што з усіх фільмаў, дзе ён здымаўся, не выключаючы «Тэрмінатара», гэты — яго любімы. Праводзе ён слоў, яму вельмі падабаецца нянычыца з дзецьмі, і зносіны з імі ў нейкай ступені дапамаглі яму падрыхтавацца да пасады губернатара Каліфорніі. Што ж, бацьку пяцярых дзяцей можна паверыць!

І на дэсерт — у Арні, як у вельмі крутога хлопца, ёсць нават уласны танк! У ЗША валодаць баявой машынай можна на законных падставах, і Шварцэнэгер купіў у Аўстрыі за 1,4 мільёна долараў тую самую машыну, на якой ён служыў кіроўцам-механікам у арміі. Дарэчы, існуе інфармацыя, што на гэтым танку ён заехаў у нейкую ваенную пабудову і... зноў трапіў на гаўптвахту.

## Нядзеля, 13 жніўня

### Беларусь 1

**7.10, 15.30 Меладрама «Кроў з малаком». (16+).**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал». (12+).
**9.45** Каробка перадач. (12+).
**10.25** Народная раніца. (6+).
**11.00** «50 рэцэптаў першага». (12+).
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Вяселля не будзе». (12+).**
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**17.20 Меладрама «Смуткірадасці Надзеі». (16+).**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Слабая жанчына». (12+).**

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў». (6+).
**7.50 Фільм для дзяцей «Беласнежка». (12+).**
**8.50, 19.00, 22.05** Тэлебарометр.
**8.55** «Калі мы дома». Скетчкам. (16+).
**10.05, 19.35** «Тата папаў». (16+).
**12.45** «Ікона стылю». Фэшншоу. (16+).
**14.30 Камедыя «Стыльная штучка». (12+).**
**16.20** Два рублі. (12+).
**16.40 Фантастыка «Зорныя войны: эпізод VII: абуджэнне сілы». (12+).**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10 Трылер «Ілюзія палёту». (16+).**
**23.55** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам. (16+).

### Беларусь 3

**7.35** «Музеі Беларусі».
**8.00, 12.20, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 12.35, 20.30, 22.25** «Гэты дзень».
**8.20** «Беларуская кухня». Рулька з хрэнам, узвар журавінавы.
**8.50 «Фантамас». Камедыя. (12+).**
**10.30** «Напярэд у мінулае».
**11.00** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.55** М/ф. (0+).
**12.40 «Без памяці закаханы». Камедыя. (12+).**
**14.20** Канцэрт Аксаны Волкавай «Solo».
**15.30 «Зорка чароўнага шчасця». Драма. (12+).**
**18.10 «Закаханы па уласным жаданні». Меладрама. (12+).**
**19.35** «Апошні дзень». Інакенцій Смактуноўскі. (12+).
**20.40** «Калыханка». (0+).
**21.05 «Душа мая, Марыя». Драма. (16+).**
**22.30 «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм. (12+).**

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Крумкачы» (Мінск) — «Днепр» (Магілёў).
**9.55** Плаванне. Этап Кубка свету. Эйндхавен.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта. 1/2 фіналу.
**14.10** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**14.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**16.40** Пляжны футбол. Еўраліга. Партугалія — Беларусь.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. 1-ы тур. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Вэст Хэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.55** Мастацкая гімнастыка. Challenge cup. Казань.
**21.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Вячэрняя сесія.
**23.20** Тэніс. Турнір WTA. Таронта. Фінал.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**7.05 Серыял «Лондангmale» (16+).**
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код» (0+).
**9.40** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**10.00** «Пакуль усе дома» (12+).
**10.50** «Слова гонару» (12+).
**11.30** «Фазэнда» (12+).
**12.35** «Дачнікі» (12+).
**16.15** Навіны спорту (з субцітрамі).
**16.20** Крысціна Арбакайтэ, Мікалай Баскаў і іншыя ў юбілейным шоу балета «Тодэс» (16+).
**18.10** «Тры акорды» (16+).
**20.00** Контуры.
**21.05** «Клуб вясёлых і знаходлівых». Летні кубак ва Уладзівастоку» (16+).
**23.25 Маст. фільм «Тры мушкецёры» (12+).**

### СТБ

**6.05, 7.20 Маст. фільм «Дзяржаўная мяжа. Кур'еры страху» (12+).**
**7.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.15, 9.30, 11.40, 15.20, 20.25** Тайны Чапман. Спецпраект (16+).
**9.05, 16.15** «Аўтапанарама» (12+).

### (працяг)

**11.00** «Вялікае снеданне» (12+).
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.45, 0.35 Камедыя «Мы з джаза» (12+).**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна» (16+).
**19.30** «Тыдзень».
**22.05 Драма «Рай» (12+).**
**23.45** «Загадкі чалавецтва» (16+).

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.10, 7.40, 8.50** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.10** «Такія дзіўныя» (16+).
**7.50** «Культ/Турызм» (12+).
**8.20** «Беларусь сёння» (12+).
**9.30** «Любімыя акцёры 2.0» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Нямы» (16+).**
**13.55 Маст. фільм «Каханая жанчына механіка Гаўрылава» (0+).**
**15.30** «Любімыя акцёры». Людміла Гурчанка (12+).
**16.15 Серыял «Гром». (12+).**
**23.25 Серыял «Вы заказвалі забойства» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху». (16+).
**7.30 Маст. фільм «Буду жыць». (16+).**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Сам сабе рэжысёр». (16+).
**12.25** «Ранішняя пошта». (16+).
**13.10** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна». (16+).
**13.45** «Пакой смеху». (16+).
**14.30, 21.35 Маст. фільм «Погляд з вечнасці». (12+).**
**20.00** Весткі.
**22.55** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** «Ты супер!» (6+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Двайныя стандарты. Тут вам не там!» (16+).
**9.15** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**10.25** «Першая перадача». (16+).
**11.00** «Цуд тэхнікі». (12+).
**11.50** «Дачны адказ». (0+).
**13.00** «НашСпажыўНагляд». (16+).
**14.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі». (16+).
**19.25 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**22.45** «Ты не паверыш!» (16+).
**23.25** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў». (16+).

### 8 канал

**9.00, 15.35, 18.55, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка».
**9.45** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**10.15** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**10.45 Серыял «Камісар Рэкс» (0+).**
**12.15 Дэтэктыў «Рубін у імгле» (16+).**
**13.50** Прыгоды «Цень палярнай зоркі» (12+).
**15.40 «Глядзім усёй сям'ёй». Камедыя «Двое. Я і мой цень».**
**18.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**19.00 Трылер «Найлепшы стралок». (12+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Д'ябал носіць Prada». (16+).**
**22.55** М/ф для дарослых.

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер». (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**8.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**9.00, 3.00** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**9.20, 3.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**9.40, 3.40** М/ф «Машыны страшылкі». (0+)
**10.00** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**10.30, 2.50** «Ералаш». (6+)
**11.00, 1.10** «Сэрцы за каханне». (16+).
**11.30** «Проста кухня». (12+).
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**13.00** Серыял «Як я стаў рускім». (16+).
**15.00** Фэнтэзі «Апошні паляўнічы на ведзьмаў». (16+).
**17.00** Анімацыйны фільм «Кароль сафары». (0+)
**18.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Драма «Банды Нью-Ёрка». (16+).
**0.15** Скетч-шоу «Валера-ТБ» (16+).
**1.30** Серыял «Татавы дочкі». (12+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Смерць пад ветразем». Маст. фільм.
**12.50** «Аркестр будучыні». Еўратур.
**13.40, 0.55** Краіна птушак. «Вясёлыя каменкі». Дак. фільм.
**14.20** «Нараджэнне нацыі». Маст. фільм. Частка 2-я.
**16.10** Геніі і ліхадзеі. Тур Хеердал.
**16.40** «Не плачце обо мне — я проживу». Акцёры МХТ ім. А. П. Чэхава чытаюць вершы Бэлы Ахмадулінай.
**17.20** «Пешшу...» Масква забароненая.
**17.45, 1.55** «Шукальнікі». «Тайная зброя арміі Ракасоўскага».
**18.35** «Песні сапраўдных мужчын». Юрыю Візбару прысвячаецца...
**19.50** «Амаль смешная гісторыя». Маст. фільм.
**22.15** Ганна Нятрэбка, Пласіда Дамінга ў оперы Дж. Вердзі «Трубадур». Пастаноўка Зальцбургскага фестывалю.
**1.35** «Крыўда». «Выкрутасы». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 2009 год (16+).
**6.40, 8.45, 9.40, 11.00, 11.40, 12.45, 17.05, 18.40, 0.55, 2.30, 3.40, 4.55** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Сумка, поўная сэрцаў» (16+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.30** Маст. фільм «Матылёк» (16+).
**12.55** Фільм-спектакль «Пена». 1977 год (16+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Ахоўвай мяне, мой талісман» (16+).
**17.25** Праграма «Рок-н-рол-ТБ». 1993 год (16+).
**18.00** «Акулы пяра». Андрэй Губін. 1998 год (16+).
**19.00** Праграма «Дванаццаты паверх». 1988 год (18+).
**20.30** «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год (16+).
**21.40** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён» (16+).
**22.00** Фільм-спектакль «Прыйшоў мужчына да жанчыны». 1990 год (12+).
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. Майк з гурта «Заапарк». 1-я частка. 2006 год (18+).
**1.30** Маст. фільм «Міраж». 3-я серыя (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 1.30** Веласпорт. «Класіка Каларада».
**5.00, 8.00, 9.45, 20.30, 2.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**6.30, 9.30, 16.15, 0.15** Веласпорт. «BinckBank Tour».
**9.30, 0.00** Watts.
**18.00** Конны спорт. Global Champions Tour.
**19.30** Лёгкая атлетыка. Усэйн Болт. Гісторыя.

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы». (0+).
**2.15** Камедыя «Дзюплекс». (12+).
**3.50** Камедыя «Няўдачлівыя». (16+).
**5.35** Камедыя «Ас». (16+).
**7.15** Меладрама «Дапамажыце стаць бацькам». (16+).
**8.55** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2». (16+).
**10.45** Камедыя «Шары лютасці». (16+).
**12.20** Камедыя «Кароль вечарынак». (16+).
**14.10** Камедыя «Бамбу». (16+).
**16.00** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**16.15** Меладрама «Заручаныя асуджаныя». (16+).
**17.50** Камедыя «Ушчэнт». (16+).
**19.30** Меладрама «Лёгкія паводзіны». (16+).
**21.10** Камедыя «Дзікая штучка». (16+).
**22.50** Камедыя «Вялікі тата». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Паненка і кулінар» (12+).
**10.35, 1.10** «Жанчына ў бядзе». Серыял (12+).
**13.50** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**15.10** «Магазіна» (16+).
**16.15, 17.15, 18.20, 19.25** «Рэвізора» (16+).
**20.30** «Без падману» (16+).
**21.20** «Афера Томаса Краўна». Драма (16+).
**23.20** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**23.50** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**4.10** «10 самых» (16+).
**4.40** «Знайсці згубленага» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 7.30** Целаахоўнік (16+).
**8.50** Іншапланецянін (6+).
**11.05** Дзень сурка (12+).
**13.05** Галодныя гульні: сойка-перасмешніца. Частка 1-я (12+).
**15.25** Параноя (12+).
**20.10** Сезон палявання-2 (12+).
**21.45** Ананім (16+).
**0.20** Я ўсё яшчэ ведаю, што вы зрабілі мінулым летам (16+).
**2.20** Страчаны рай (18+).
**4.50** Уладар пярсцёнкаў: дзве крэпасці (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Вясёлая моладзь (12+).
**8.10** Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
**10.05** Блаславіце жанчыну (12+).
**12.25** Падкідыш (0+).
**13.50** Ваўкадаў (16+).
**16.35** Дзень дурня (16+).
**18.25** СуперБабровы (12+).
**20.20** Галасы вялікай краіны (6+).
**22.20** Іерэй-сан. Споведзь самурая (16+).
**0.20** Клінч (16+).
**2.20** Смайлік (16+).
**4.10** Канікулы строгага рэжыму (12+).

### National Geographic

**6.00** Папулярная навука. (12+).
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55** Цуды інжынерыі. (12+).
**10.20, 15.35** Мегазаводы. (12+).
**11.05** Прарыў. (12+).
**11.50** Пачатак. (12+).
**12.35** Гульні розуму. (12+).
**14.05** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**14.50** Сапраўдны суперкар. (12+).
**16.25** Інжынерныя ідэі. (12+).
**17.15** Другая сусветная вайна: асушэнне акіяна. (12+).
**18.00, 21.00, 0.45** Фідэль Кастра: страчаныя плёнкі. (16+).
**18.45** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас. (16+).
**19.30, 21.45, 1.30** Твар у твар. (16+).
**22.30, 2.15** Паранармальнае. (16+).
**23.15** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**0.00** Востраў бунтароў. (12+).
**3.05** Секунды да катастрофы. (16+).
**3.55** Код небяспекі. (12+).

### Discovery

**8.00** Палянічыя на рачныя дыяменты. (16+).
**11.00, 7.10** Загадкі планеты Зямля. (16+).
**12.00, 21.00** Бітвы робатаў. (12+).
**13.00, 22.00** Амерыканскія вынаходнікі. (12+).
**14.00** Кола: гульня на выжыванне. (16+).
**15.00** Смяротны ўлоў. (16+).
**16.00, 23.00** Узрываючы гісторыю. (6+).
**17.00, 1.00** Д'ябальскі каньён. (12+).
**18.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**19.00** Клінічны выпадак. (16+).
**0.00** Вялікі махінатар. (12+).
**2.00** Стальныя хлопцы. (16+).
**4.40** Космас навыварат. (12+).




## ШЧАСЛІВАЯ РЫБАЛКА

Лета — не толькі час адпачынку, але і цяжкай працы. Як той співаў «А ў суботу сэрца плача: зноў на дачу, зноў на дачу...»

У майго калегі яна знаходзіцца паблізу з горадам, у чароўным кутку на беразе невялікай рачулкі, аднак на ўзвышшы, таму паліваць гарод даводзіцца досыць часта. Добра, што машына ёсць — можна мігам крутнуцца. Ды і сын, памочнік, расце... Праўда, малы пакуль: то градку патопча, то зялёнага агрэсту натрушчыцца, то замест травы моркву павырывае. Шкоды, карацей, часам больш, чым падмогі.

Вось і той раз бацька даў яму вудачку, і адправіў да рэчкі.

Малы, вядома ж, пайшоў — усеўся на беразе, чакае ўлову. Але таго няма: не тое, што вялікага, — аніякага, ні праз 10 хвілін, ні праз 40... Не тыя, відаць, чарвякі? Ці дзень? Ці рэчка... Для сына...

У бацькі — у адрозненне ад яго — усё як след ішло: за тыя ж 40 хвілін ён паспеў зрабіць ці не ўсё, што планаваў. Засталося хіба градкі паліць.

З вёдрамі прыйшоў да рэчкі.

— Як рыбалка? — папытаўся ў малога.

— Ды ніяк! Няма тут ніводнай рыбкі! Паплавок нават не варухнуўся ні разу!

— Ну, тады складвай вудачкі. Я гарод палью, і паедзем дадому.

Сын з вудамі падаўся ў бок лецішча. Бацька трохі пастаяў на беразе, набраў у вёдры вады, рушыў следам, як тут, наперарэз яму, двое абарыгенаў. Пытаюцца:

— Мужык, рыба свежая трэба?

— Адкуль?

— Ды з рэчкі. Сёння паўдня рыбачылі. Улоў багаты. Бяры (паказваюць пяць акунёў), нядорага аддадзім...

«Калі так, — думае дачнік, — то чаму б не ўзяць? Свежая рачная рыба (яшчэ нават жывая!) — гэта ж не крамная — перамёрзлая»...

Карацей, старгаваліся яны — дачнік узяў акунькоў.

Куды палажыць? Ну, вядома ж, у вёдры з вадой.

Прынёс іх на дачны ўчастак.

— Ну, што, сынок, — кажа малому, які ўжо пакуе рэчы, — не ўмееш ты пакуль што рыбу лавіць. Ідзі, паглядзі, як трэба: бярэш, значыцца, вядро, зачэрпваеш вады — і ўсё, гатова... Рыбы — на добрую юшку.

Хлопчык слухае і, вядома ж, не верыць (жартуе бацька!), але да вёдзер ідзе...

І цяжка сказаць, што — рот ці вочы — акругляецца ў яго больш...

Ва ўсякім разе, у кампаніі аднагодкаў ён, магчыма, і цяпер выхваляецца той рыбалкай. Кажа, што бацьку яго-наму вельмі шчасціць — рыба сама ў вёдры скача.

**Анатоль Палынскі,**
*г. Беразіно.*

## КОСТАЧКА НА ЎСПАМІН

...У тыя часы асноўнай прыладай у бухгалтарскай справе быў не камп'ютар і нават не калькулятар, а канторскія лічыльнікі — драўляная такая рамка з костачкамі-колцамі на стальных пртутках.

Якраз яна, гэтая прылада, і стала ледзь не галоўнай гераіняй маёй гісторыі, другой, вядома ж, пасля дзяўчыны-бухгалтаркі.

Тая працавала ў невялічкай мястэчковай канторы, мела ад роду гадоў пад трыццаць — на добры толк ужо і замуж пара, але ж неяк ніхто не клікаў. Хіба...

Заляцаўся крыху да гэтай дзяўчыны заезджы інспектар, неяк нават начаваць у яе застаўся.

Яна пасля гэтага ўжо, відаць, «злажыла і палажыла», як той казаў: у марах выйшла за хлопца замуж, нарадзіла дзяцей ды жыла-пажывала... Як тут да мястэчка далуцела горкая вестка, што ў гэты час інспектар жаніўся з іншай.

На вочы бухгалтарцы пасля такой неспадзеўкі лепш было не паказвацца, але ж вытворчасць ёсць вытворчасць, начальства ёсць начальства: інспектар мусіў зноў паехаць у тое мястэчка, у тую невялічкую кантору.

Зайшоў, сеў там на вольнае крэсла (падалей ад бухгалтаркі) — пачаў размову з кіраўніком і, мусіць, аслабіў пільнасць, бо далей...

Па словах відавочцаў, гэта быў «кідок пантэры» — нечаканы, імгненны... І ўдар — акурат такі ж: па галаве... Ад чаго пруткі ды костачкі лічыльнікаў разляцеліся па баках, а сам інспектар залыпаў вачамі і закруціў галавой, нібы той жарабчык, на шыю якога раптам надзелі хамут...

«Пантэра» пасля гэтага куляй выскачыла ў дзверы, трое мужчын цішком душыліся смехам, адзін — асцярожна здымаў з шыі, з галавы тое, што засталося ад лічыльнага апарата.

Ён — якая-ніякая, але ж дзяржмаёмасць: проста так яе з уліку не спішаш. Значыць, трэба рамантаваць, а найперш па канторскіх кутках збіраць «запчасткі».

Як быццам невялікае там памяшканне і людзі стараліся, але адну светлую костачку так і не знайшлі. Меркавалі, што бухгалтарка ў космас яе запусціла, бо толькі-толькі паляцелі першыя спадарожнікі зямлі.

Іншыя ж казалі, што тую прапажу інспектар звёз, што яна яму запала не тое ў мазгі, не тое ў кішэню, каб надалей помніў, дзе трэба начаваць, дзе не.

**Іван Сіманёнак,**
*г. Паставы.*

## НЕ ТАКІ СТРАШНЫ ЧОРТ...

Здарэнне гэтае адбылося гадоў сорак таму, калі тэлебачанне яшчэ не паказвала таго, што паказвае... Адпаведна, Андрусю, старому, але досыць прагнаму кавалеру, даваліся самому арганізаваць сабе кіно ў стылі «ню», прычым дакументальнае.

Да «прагляду» наш герой рыхтаваўся загадзя: злазіў на гарышча старэнькай лазні, што стаяла за гародамі, пракалупаў там у столі дзірку, замаскіраваў яе сенам...

У суботу бліжэй да вечара пайшоў глядзець. Спачатку і гадзіны са дзве, можна сказаць, «плавіўся» — чакаў, пакуль памыюцца мужчыны, пакуль возьмуць па чарцы-другой ды нагамоняцца...

Урэшце яны сталі разыходзіцца, распаўзацца па хатах. Марудзіў толькі дзед Юзік, які, крыху перабраўшы, зусім разамлеў ад духу і заснуў (у майцы ды акулярах) у прылазніку з валёнкам пад галавой.

— Пень стары, — закрычала, з'явіўшыся, ягоная жонка. — Як жа табе не сорамна? Паглядзіце: ён з маладымі чарка ў чарку п'е! І што далей?..

Далей, сабраўшыся мыцца, жанчыны (іншага выйсця не бачылі) усцягнулі на дзеда порткі і акуратна вынеслі яго пад вярбу — няхай цверазее.

Самі ж, галюткія (усхваляваны Андрусь ужо выцягнуў з дзіркі «затычку» — вокам прыпаў да «экрана»...), пабралі тазікі-ра́жкі, налілі вады, плюхнулі яе на камяні — паддалі духу. А таму «глядач», як ні стараўся, анічога згледзець не мог. Горш за тое — старыя падгнілыя дошкі спачатку затрашчалі пад ім, а потым...

Скончылася «кіно», так і не пачаўшыся, бо Андрусь — разам з пяском ды мяліннем — прызямліўся ў цэнтры лазні.

Аб край лаўкі разбіў лоб, а ў дадатак «падваліў» жанкі — палічылі скабы (хто венікам, хто ражкай), аблілі вадой, твар абмазалі сажай.

Факт, што дзед Юзік, убачыўшы, як з лазні выскачыў чорт — чорны, кудлаты, страшны — у момант працверазеў.

А мужчыны ў вёсцы яшчэ доўга даймалі Андруся, — пры кожным зручным выпадку прасілі:

— Ну раскажы, што ты бачыў у лазні?

— Нічога, — злаваўся той і пераводзіў размову на нешта іншае.

**Алена Несцяронак,**
*г. Докшыцы.*

## НІХТО НЕ ХАЦЕЎ АДСТУПАЦЬ

Надакучыла нашай суседцы Марыі корпацца на градах, дзень пры дні то сеяць-саджаць, то палоць-паліваць, то са шкоднікамі змагацца... Закінула яна свой гарод і прыдбала козачак. Разлік быў такі: па-першае, свае і вельмі карыснае малачко, падругое, ніякіх праблем: толькі і знай, што гуляй сабе з козамі па лузе ці лесе.

Рана-раненька, значыць, выганяе Марыя свой статак і да вечара сядзіць каля яго, адпачывае, бо козы ні на крок ад яе. Ды калі і стрэліць якой адысціся, на варце стаіць казёл Козя. Ён спраўна службу нясе: разоў колькі травы скубане і «рогі ўверх» — пазірае, ці ўсе яго сяброўкі побач, ці няма дзе пагроз, паказвае — усім сваім відам — што лепей іх не чапаць, бо тады мала не падасца.

І сапраўды каму-ніякаму перападала ад казла, але ж і яму аднойчы таксама. Ды так неспадзеўна...

Неяк раз, значыць, пасвіла Марыя сваіх коз каля дадатковых дачных участкаў. Нехта на іх кабачкі вырошчвае, нехта бульбу...

Тая дачніца якраз палола яе, а побач — унучак круціўся, госцік дарагі — ледзь прычакала на лета. І цяпер ён то ляцеў як самалёт, то гудзеў машынаю, то сачыў за мурашом, то размаўляў з жабкаю, то...

Матылёк аднекуль прыляцеў, пакружыўся над ім і падаўся якраз туды, дзе хадзілі козы. Хлопчык — следам за ім. А казёл ужо рогі падняў, чакае...

Малы ў нейкім метры таксама аслупянеў — спыніўся, але ж не тое што крыкнуць, нават піскнуць не можа.

Казёл толькі гэтага і чакаў: вочы вылупіў, рогі выставіў і вайной...

Бабулі — шкада — гэтага не бачылі: адна драмала пад цёплым сонейкам, другая — палола бульбу. Таму хлопчык мусіў бараніцца сам: хутчэй падсвядома ён махнуў рукой, у якой меў звычку насіць... палку. Такім чынам ні стуль ні ссюль казёл атрымаў паміж рог і аслупянеў таксама: адступіў на нейкі крок, пакруціў галавой — зноў пайшоў у наступ і зноў атрымаў па галаве, бо малы тым часам ачомаўся ад першага жаху і вырашыў абарону трымаць да канца: аж пакуль не прыйдзе падмога.

Яна, дзякуй богу, чакаць сябе не прымусіла: адна бабуля прачнулася, другая кінула рваць пустазелле — прыбегла выручаць унука, хоць гэта і нялёгка было, бо Козя ну ніяк не хацеў адступаць: злосна мэкаў, круціў галавою ды рваўся ў бойку, бо казёл ён і ёсць казёл...

Затое бабулін унук потым усім расказваў, як ён перамог таго ворага, як адлупцаваў яго.

Пра тое, як сам спужаўся, — ні слова ні паўслова. Мужчына...

**Раіса Васільева,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Дзеля памяці

# ШУКАЛЬНІК БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЦЯ



**Успамінаючы архівіста Віталя Уладзіміравіча Скалабана ў дні яго 70-годдзя, канешне ж, першае, пра што пачынаеш думаць: як рана пайшоў з жыцця гэты апантаны збіральнік памятак беларускага жыцця. Не стала яго ў 2011 годзе. Улетку...**

З нашым выдавецтвам «Літаратура і мастацтва» яго ядналі многія ідэі. Так, Скалабан перш-наперш успамінаецца праз прызму менавіта ідэй, праз прызму яго ўяўленняў пра магчымыя здзяйсненні. І нават часам, калі нешта не ўдавалася ажыццявіць па аб'ектыўных прычынах, сама ідэя набывала фармат дзеі. Хоць, канешне ж, і зробленага за ім, зробленага з яго падказак можна налічыць нямала... Уражваюць абсягі яго асабістых зацікаўленняў, абсягі яго жаданняў і памкненняў.

Сустракаючыся з Віталем Уладзіміравічам у розных рэдакцыях (а знаёмства наша адносіцца да першай сустрэчы ў рэдакцыі гісторыі выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» на самым пачатку 1990-х гадоў), заўсёды дзівіўся яго добраму, светламу настрою. Нават апошнія сустрэчы ў «ЛіМе», калі ён чарговы раз выйшаў з бальніцы (як і тэлефонныя размовы пасля адпаведных працэдур, прыняцця лекаў, калі яму, пэўна, і гаварыць было цяжка), былі даволі лёгкімі, прыязнымі. І калі ўжо ён сыходзіў з выдавецтва альбо калі тэлефон замаўкаў, думалася пра самае страшнае, пра тое, што і яго забірае смерць. Адлік часу ішоў... А гаварылі мы ўсё адно пра справу, пра новыя публікацыі...

Мне пашчасціла быць выдаўцом, хутчэй нават — мне пашчасціла быць сведкам зносін Віталя Уладзіміравіча з выдавецтвам. У «ЛіМе» ішоў «трохтомнік» «Купала і Колас, вы нас гадавалі...». Размова — пра зборнік дакументаў з розных архіваў, прысвечаных народным песнярам Беларусі — Якубу Коласу і Янку Купалу. Канешне ж, над кнігай працавала каманда з Нацыянальнага архіва Беларусі. Быў у гэтай каманды і дарадца, падказчык самы што ні ёсць аўтарытэтны — член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі літаратуразнаўца Міхась Іосіфавіч Мушынскі. Можна назваць многія імёны тых, хто спрыяў нараджэнню зборніка. І ўсё ж Віталь Уладзіміравіч — галоўны арганізатар і галоўны, лічы, «аўтар» (архівісты, канешне, укладаюць, упарадкоўваюць, яны дакументы не перапісваюць, не перарабляюць згодна з сваім, калі хочаце, мастацкім мысленнем) не толькі навуковага, але і творчага праекта адкрыцця купалаўскіх і коласаўскіх дакументаў.

Віталь Скалабан змог паяднаць дзеля вырашэння адной супольнай задачы многіх людзей — архівістаў, музейшчыкаў, бібліёграфаў. Не толькі з Беларусі, але і з Расіі. Нарадзілася кніга, якой будуць карыстацца ва ўсе часіны, пакуль будуць помніць народных песняроў Беларусі Купалу і Коласа, пакуль будзе жыць і квітнець беларускае слова. Гэты «трохтомнік» меў у прынцыпе процьму шанцаў не выйсці ў свет альбо выйсці нашмат пазней. Ці выйсці дастаткова абмежаваным тыражом. Што ўвогуле зрабіла б актуальную па розных прычынах кнігу малавядомым выданнем. Па-першае, адпужваў аб'ём (спярша была ідэя выдаць увесь архіўна-даументальны збор адной кнігай, пад адной вокладкай). Па-другое, нават калі ўжо пабачыла свет першая кніга, працягу работы заміналі сумненні пра распаўсюджванне спецыфічнага, далёка не масавага выдання. Хто стане чытачом кнігі дакументаў? Тыраж у 1000 экзэмпляраў для томіка архіўных матэрыялаў — справа рызыкоўная.

Але і з распаўсюджваннем атрымалася, усё склалася. Хоць і не было гэта такой простай справай. І болей як тысячу старонак — дзве велізарныя скалабанаўскія папкі — расклалі на дзве кнігі, а пасля і другую кнігу падзялілі яшчэ на дзве часткі. У выніку атрымалася трохкніжжа. Адным словам, выданне «Купала і Колас, вы нас гадавалі...» здзейснілася.

Апошняя прэзентацыя (ужо пасля поўнага завяршэння праекта) праходзіла ў Нацыянальным архіве Беларусі. Без Віталя Скалабана, які на той час ужо пакінуў гэты свет... Зразумела, ці не ўсе выступоўцы згадвалі Віталя Уладзіміравіча. І тады думалася пра вартасць высокай адзнакі гэтай працы, не позна, мяркую, гэта зрабіць і зараз...

Згадаўшы фактычна адзін толькі «эпізод» шматаблічнага жыцця Віталя Уладзіміравіча, ведаю, што такіх спраў за ім лічыцца далёка не адна. Неяк на аўтобусным прыпынку ён сказаў пра расхрыстанасць, пра тое, што раскідаў сябе па розных клопатах. Гэта прагучала ў звязку з навуковымі здабыткамі ці адзнакамі — маўляў, магла б даўно быць напісанай доктарская...

І доктарская дысертацыя, і манаграфіі па тых перыядах беларускай гісторыі, якія цікавілі яго найперш, — усё гэта магло б, зразумела, адбыцца і, відаць, было б не лішнім. Не толькі асабіста для Віталя Уладзіміравіча, але і ўвогуле для беларускай гістарычнай навукі. Але ён адбыўся ў іншым. Праз розныя практычныя здзяйсненні — публікацыю дакументаў, выступленні ў перыядычным друку, праз дакументальныя фільмы і тэлевізійныя перадачы, а яшчэ праз шматгадовае супрацоўніцтва з газетай «СБ. Беларусь сегодня», праз многія і многія выступленні на канферэнцыях, чытаннях, праз тысячы падказак і аргументаваных кансультацый для іншых — ён зрабіў неверагодна шмат. Зрабіў дзеля вяртання сапраўднай беларускай гісторыі. Такім ужо склаўся яго лёс. Шчаслівы лёс сумленнага навукоўца.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**

# Белинвестбанк

С 05.09.2017 ОАО «Белинвестбанк» в одностороннем порядке уменьшает размер процентных ставок по срочным банковским вкладам (депозитам) физических лиц в долларах США и евро по следующим видам договоров срочных банковских вкладов (депозитов), заключенным в срок до 04.08.2017, и устанавливает их в следующих размерах:

*% годовых*

| Срочный отзывный банковский вклад (депозит) с правом востребования (код 2201007), размещенный в период с 19.11.2015 до 06.02.2017 | Срок вклада (депозита), по истечении которого допускается снятие всей суммы без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| USD/ EUR | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
| | 1,3% | 1,5% | 1,9% | 2,2% |

| Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) (код 2201021), размещенный в период с 19.11.2015 до 06.02.2017 | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| | 12 мес. | 24 мес. | 36 мес. |
| USD/ EUR | 2,3% | 2,5% | 2,7% |

| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) «Личный выбор» (код 2201020), размещенный в период с 19.11.2015 до 06.02.2017 | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| USD/EUR | 1 год | 2 года | 3 года |
| | 2,3% | 2,5% | 2,7% |

| Срочный банковский вклад (депозит) с правом востребования (код 2201007), размещенный до 10.09.2015 | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 2 года |
| USD/EUR | |
| До 10 000 (включительно) | 2,2% |
| свыше 10 000 | 2,2% |

| Срочный банковский вклад (депозит) с правом востребования (2201007), размещенный в период с 10.09.2015 до 12.11.2015 | Срок, по истечении которого допускается снятие всей суммы без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| USD/EUR | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
| | 1,3% | 1,5% | 1,9% | 2,2% |

| Срочный банковский вклад (депозит) (код 2201006), размещенный до 12.11.2015 | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| USD/EUR | 12 мес. | 36 мес. | 60 мес. |
| | 2,0% | 2,2% | 2,2% |

| «Срочный банковский вклад (депозит) «Личный выбор» (код 2201017), размещенный до 12.11.2015 | | | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 год | 2 года | 3 года |
| Условия частичного снятия денежных средств | % частичного снятия | % остатка средств во вкладе (депозите) | Процентная ставка USD/EUR | | |
| | 90% | 10% | 1,9% | 2,1% | 2,3% |
| | 50% | 50% | 2,0% | 2,2% | 2,4% |
| | 10% | 90% | 2,1% | 2,3% | 2,5% |

| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) «Активный» (код 2201025), размещенный в период с 19.11.2016 до 06.02.2017 | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 360 дней |
| USD/EUR | 1,9% |

| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) с правом востребования» (код 2201007), размещенный в период с 06.02.2017 до 04.08.2017 | Срок вклада (депозита), по истечении которого допускается снятие всей суммы без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
индивидуальным предпринимателем (далее ИП) копия свидетельства о государственной регистрации ИП без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или ИП – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или иной документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия документов, подтверждающих государственную регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

4. **Сумма задатка перечисляется на р/с BY88A BB36006110002020000000, ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Минск, AKBBBY2X, получатель – ГУ МФ РБ по Минской обл., код платежа 04901.**

5. Аукцион признается несостоявшимся или нерезультативным, если заявление на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион. Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене.

6. Победитель аукциона должен подписать протокол в день проведения аукциона. Внесение платы за предмет аукциона осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

7. Шаг аукциона – 5 процентов от предыдущей цены, называемой аукционистом.

8. В случае если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона, не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона, не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин, внесенный ими задаток не возмещается

Дополнительную информацию можно получить по тел.: 8 (01715) 5-57-71, 5-56-39.

УНП 600041227

## РУП «Жилкоммунтехника»

**в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-Консультант» извещает о проведении повторных торгов со снижением начальной цены в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего предприятию на праве хозяйственного ведения**

| Лот № 1 | Изолированное помещение (Помещение гостиницы) с инв. №714/D-11556. Площадь – 196,5 кв. м. Г. п. – 1994. Этажей – 1. | Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** |
|---|---|---|---|---|
| | | | 57 888,00 | 2 894,40 |

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,1076 га с кадастровым номером 724850100001000516. Право постоянного пользования. Доля РУП «Жилкоммунтехника» составляет 11/200. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

| Лот № 2 | Шесть единиц капитальных строений | г. Минск, ул. Чапаева, д. 4. | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** |
|---|---|---|---|---|
| | | | 1 493 100,00 | 74 655,00 |

1. Здание склада (литер А 2/к) с инв. № 500/С-8445. Площадь – 2195 кв. м. Г. п. – 1954. Этажей – 2. 2. Здание проходной (литер Б 1/к) с инв. №500/С-8494. Площадь – 10,1 кв. м. Г. п. – 1953. Этажей – 1. 3. Здание специализированное автомобильного транспорта (литер Ж 1/к) с инв. №500/С-36553. Площадь – 21,1 кв. м. Г. п. – 1996. Этажей – 1. 4. Гараж (литер В 1/м) с инв. №500/С-23647. Площадь – 74,2 кв. м. Г. п. – 1988. Этажей – 1. 5. Гараж (литер Д 1/м) с инв. №500/С-23648. Площадь – 46 кв. м. Г. п. – 1988. Этажей – 1. 6. Гараж (литер Г 1/м) с инвентарным номером 500/С-23649. Площадь – 109,9 кв. м. Г. п. – 1988. Этажей – 1. На капитальные строения с инв. №500/С-8494; 500/С-36553; 500/С-23647; 500/С-23648; 500/С-23649 имеются свидетельства о регистрации

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,4575 га с кадастровым номером 500000000001000440. Целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания административного здания. Право временного пользования. Срок действия по 31.05.2021. Описание права, ограничения (обременения) прав: - Охранная зона водопровода, площадь 0,0583 га; - Охранная зона трубопроводов, площадь 0,1539 га; - Обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 0,4575 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победителем аукциона признается участник, предложивший более высокую цену за предмет аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) при необходимости осуществляет оформление всех документов, связанных с регистрацией сделки купли-продажи, оформление прав собственности на Объект (Объекты)

**Аукцион состоится 18.08.2017 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 25, каб. 209. Шаг аукциона – 5%**

Задаток перечисляется на р/с BY93BLBB30120100135569001001 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ №538 г. Минск, код BLBBBY2X. Получатель – РУП «Жилкоммунтехника», УНП 100135569. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), проводимом 18 августа 2017 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.30 до 17.30 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209. Окончание приема заявлений 17.08.2017 в 12.00.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.06.2017.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, можно получить по e-mail: jkt@tut.by. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Ковальская Наталья Николаевна, 8 (029) 395-36-35.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов. Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

**☎ Организатор аукциона (Продавец): 8 (017) 204-71-51, 8 (029) 395-36-35 • e-mail: jkt@tut.by**

## РУП «Жилкоммунтехника»

**в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-Консультант» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего предприятию на праве хозяйственного ведения, со снижением начальной цены**

Лот № 1. Автомобиль Volkswagen Polo, номер кузова WVWZZZ9NZ3Y005797, 2003 г. в. Тип ТС – легковой хэтчбэк. Цвет – черный. Двигатель – бензиновый. КПП – механическая. Количество мест – 5. Количество дверей – 3. Оборудование – автомагнитола. Шины – летние. Диски – штампованные. Транспортное средство не на ходу. Местонахождение: г. Минск, ул. Чапаева, 4. **Начальная цена – 3 318,80 бел. руб. Задаток – 165,94 бел. руб**.

УСЛОВИЯ

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Затраты, связанные со снятием транспортного средства с учета, несет Победитель аукциона (Претендент на покупку).

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

До даты проведения аукциона с участниками заключается соглашение, в котором предусматриваются права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, в том числе размер штрафа, уплачиваемого участником, выигравшим торги, но отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона и (или) возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, при этом размер штрафа составляет 100 базовых величин.

**Аукцион состоится 18.08.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 25, каб. 209. Шаг аукциона – 5%.**

Задаток перечисляется на р/с BY93BLBB30120100135569001001 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ №538 г. Минск, код BLBBBY2X. Получатель – РУП «Жилкоммунтехника», УНП 100135569. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №1), проводимом 18 августа 2017 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.30 до 17.30 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209. Окончание приема заявлений 17.08.2017 в 14.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Сайко Андрей Геннадьевич, тел. 8 (044) 552 42 92.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.042017.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, можно получить по e-mail: jkt@tut.by.

**☎ Организатор аукциона (Продавец): 8 (017) 204-71-51, 8 (029) 395-36-35 • e-mail: jkt@tut.by**



■ Неасабісты суб'ектыў

# «Добрага дня Вам!»

## Грамадскі інстытут пад назвай «суседзі» хутка спыніць сваё існаванне?

Учора ўвечары ў пад'ездзе нашага дома, там, дзе таварыства ўласнікаў размяшчае самыя важныя аб'явы, з'явілася вось гэта пісьмо. Напісанае на вучнёўскім аркушы ў клетачку акуратным каліграфічным почыркам, яно прыцягвала позірк ад самых дзвярэй... «Паважаныя жыльцы! Учора на мой прыадчынены балкон заляцеў, маць яго, АКУРАК! Убачыла я гэта толькі вечарам, вярнуўшыся з працы. Ляжыць сабе спакойненька, дыван мне прапаліў. Не трэба апісваць, што магло адбыцца... Грошы, каб купіць цыгарэты, у вас ёсць, дык купіце сабе попельніцу або напішыце нумар кватэры, я зайду і падару яе вам. Не кідайце акуркі з балкона!!! Сыходзячы з дому, хочацца вярнуцца ў тую самую кватэру, а не ў тое, што ад яе можа застацца, «дзякуючы» табе бездакказным людзям, як вы. Дзякуй! Добрага дня Вам!..» Як доказ скотчам да аркуша быў прыклеены той самы акурак ад тонкай «дамскай» цыгарэты...

Людзі ішлі, спыняліся, асуджальна хісталі галовамі, выказвалі спачуванне той жанчыне з восьмага паверха, разважалі паміж сабой, якія сапраўды бездакказныя ёсць у нашым доме таварышы. Не выключана, што сярод асабліва заўзятых крытыкаў быў і той, хто за два дні да гэтага той акурак шпурнуў уніз. Ніхто ўсё роўна не даведаецца. Як і аўтарка гэтага прачулага пісьма для амаль усіх (за выключэннем аднаго-двух чалавек ды, можа, яшчэ дворнічыхі Паліны) засталася для астатніх суседзяў па доме невядомай...

Зрэшты, «суседзі» — гэта я занадта... Суседзі — гэта людзі, з якімі не толькі жывеш побач і вітаешся пры сустрэчы. Гэта тыя, да каго бяжыш і з бядой і з радасцю, у каго можна пазычыць усё, што трэба, — ад солі да падушкі, з кім сустракаеш святы і дапамагаеш (ці сам атрымліваеш дапамогу) у самым страшным горы. Прынамсі, так было спрадвеку, так закладзена ў нашай геннай (вясковай, па сутнасці сваёй) памяці. Канешне, не заўсёды суседзі жывуць мірна, кожны, хто родам з вёскі, можа прыгадаць сваіх зямлячак, якія не мірыліся з-за пядзі зямлі або з-за таго, што куры адной павыграбалі грады ў другой. Якія яны праклёны адна на адну сыпалі, як артыстычна сварыліся — заслухацца можна было! Але нават у гэтых сварках не было абыякавасці і раўнадушша, дый мірыліся цёткі хутка (дакладней, «мірыла» іх вяселле ці, не дай Бог, пахаванне: і туды, і туды пасуседску грэх было не прыйсці, і ўсякая варожасць забывалася).

У гарадскіх дамах, асабліва «высотках», дзе нават лесвіцы агульнай няма — толькі пажарная, па якой ніхто не ходзіць, — усё інакш. Нават пасля амаль дваццаці гадоў, што жывём у доме, ведаем адно аднаго толькі ў твар, і то не ўсіх. З кімсьці вітаемся, перакідваемся парай ветлівых слоў — тут ужо справа абсалютна суб'ектыўнай сімпатыі ці наадварот. Але мы не суседзі (не тыя, хто, згодна з этымалогіяй гэтага агульнаславянскага слова, «сядзіць побач» — значыць, жыве, грунтоўна, аднолькі і назаўсёды), мы, у лепшым выпадку, — сужыхары. Якім абсалютна няма адно да аднаго ніякай справы, якія не знаходзяцца адзін ад аднаго ў нейкай залежнасці (ці думаюць, што не знаходзяцца, да таго часу, пакуль кінуты з верхняга паверха акурак не падпаліць дыван на балконе). Якія ў вялізным «вуллі» жывуць абсалютна адасоблена ад іншых і пляваць на інтарэсы іншых хацелі. У нас у доме запіраюцца знутры калідоры, у якіх знаходзяцца дзверы ўласна ў кватэру, і калі цябе, напрыклад, заліваюць зверху, ты не можаш падняцца і пазваніць — даводзіцца спускацца і званіць з ганка ў дамафон, і не факт, што цябе будуць слухаць. Таму падобныя запіскі, адрасаваныя невядома каму, з'яўляюцца ў пад'ездзе з зайздроснай перыядычнасцю: то ўшчуваюць аматараў караоке, якія не давалі спаць усю ноч, то невядомых гаспадароў невядомага сабакі, які вые на досвітку, то рупліўцаў ранняга рамонту, якія ўключаюць балгарку ў пяць гадзін. Сужыхары ходзяць міма, чытаюць, думаючы (ці робячы выгляд), што гэта не пра іх. Чужыя абыякавыя людзі пад адным дахам... Гэта для іх — для нас — страхавыя кампаніі прапануюць новы від страхавання, ён так і называецца: «Ад суседзяў».

І ў вёсцы не лепш. Прыезджыя гараджане, якія купляюць хаты ці ўчасткі, прывозяць з сабой ужо гэту, «сужыхарскую» філасофію. Яны не збіраюцца станавіцца суседзямі, ім усё роўна, хто жыве побач. Не кажу пра ўсіх, канешне, але мне пашанцавала менавіта з такім досведам. Цэлае лета новы гаспадар участка, што каля нашага дома, паліць высечанае ламʼё. Ці вецер ёсць, ці няма — яму ўсё роўна. Спрабавалі паўшчуваць — адказ адзін: у мяне выхадны, таму раблю і рабіць буду. Цяпер маўчым, глытаем дым, як і астатнія суседзі. Бабулі лічаць, што той чалавек малады і не здагадваецца, што на вёсцы так не робяць: ці мала якая іскра пад страху заляціць, дый як людзям на агародзе працаваць? Што ён пажыве тут, «абаб'ецца» і ўсё зразумее. Не хачу іх пераконваць у іншым, бо не паверац, але, сама ўжо гараджанка са стажам, ведаю, што адзінай управай на гэтага «жраца агню» быў бы званок у службу «101» і, як непазбежны вынік, — унушальны штраф за распальванне вогнішча блізка ад жылых пабудоў...

Чаму я так і не зрабіла? Хочацца па-людску, па-суседску. Трэба ўсё-ткі на выхадных падысці, папытацца, як яго завуць...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.29 | 21.02 | 15.33 |
| Віцебск — | 5.11 | 20.57 | 15.46 |
| Магілёў — | 5.19 | 20.52 | 15.33 |
| Гомель — | 5.21 | 20.42 | 15.21 |
| Гродна — | 5.45 | 21.16 | 15.31 |
| Брэст — | 5.51 | 21.10 | 15.19 |

## Месяц

*Поўня 7 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

**Пр.** *Марыі, Магдаліны, Аляксея, Карнілы, Міхаіла, Фокі.*
**К.** *Дамініка, Пратаза, Яна.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 4 ЖНІЎНЯ

**1668** год — дзень нараджэння шампанскага. З'яўляючыся эканомам пры абацтве Атвільер, размешчаным у самым цэнтры Шампані, манах-бенедыктынец П'ер Перыньён загадваў харчовымі запасамі і склепамі, а ў вольны час займаўся эксперыментамі па вытворчасці розных він. І вось 4 жніўня 1668 года айцец Перыньён прадставіў здзіўленай браціі незвычайны напой: серабрыстыя бурбалкі падымаліся з дна куфля, празрыстая пена іскрылася, нібы жывая. Гэта пеністае віно стала прабацькам сучаснага шампанскага, 4 жніўня — днём нараджэння гэтага напою, а імя Перыньён пасля — маркай французскага шампанскага прэміум-класа. Дарэчы, П'ер Перыньён не толькі першым вырабіў шампанскае, але таксама прапанаваў замест звычайнай у той час затычкі з прамасленай палкі ўжываць корак, які выкарыстоўваецца і па сёння.




**1912** год — нарадзіўся Рауль Валенберг (1912—1947), шведскі дыпламат, вядомы сваёй дзейнасцю па выратаванні венгерскіх яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны.

**1915** год — пасля паражэнняў на франтах Першай сусветнай вайны часці расійскай арміі пакінулі тэрыторыю Польшчы. Завяршылася амаль стагадовае панаванне расійскага прастола ў Варшаве і Каралеўстве Польскім. 5 жніўня Варшава была акупавана нямецкімі войскамі.

**1922** год — 95 гадоў таму быў створаны Цэнтральны архіў БССР (першы загадчык архіва — З. Х. Жылуновіч).

**1945** год — у вёсцы Вязынка Маладзечанскага раёна ў доме, дзе нарадзіўся Янка Купала, заснаваны філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы «Вязынка». Заснаваны згодна з пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР «Аб увекавечанні памяці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы». Адкрыты для наведвальнікаў 20 чэрвеня 1948 года. З 1972 г. уваходзіць у Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка». Размяшчаецца ў доме, дзе нарадзіўся Я. Купала. Экспазіцыя складаецца з мемарыяльнай і гісторыка-літаратурнай частак.

**1947** год — нарадзіўся (вёска Велікарыта Маларыцкага раёна) Мікола Селяшчук, беларускі мастак. Працаваў як жывапісец, графік. Майстар эксліброса. Сярод работ: «Хронікa аднаго вечара», «Канец сезона туманоў», «Наведванне сядзібы Агінскага ў Залессі» і інш. Афарміў кнігі Я. Янішчыц, Я. Сіпакова, З. Бядулі, Я. Коласа. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992). Трагічна загінуў у 1996 годзе.

Было сказана

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**

*«Эх ты, жыццё, жыццё людское!*
*Няма табе, няма спакою:*
*Ты — суматоха, вір бурлівы,*
*Ў табе загіне баязлівы».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Хлопец пахудзеў на 15 кілаграмаў за 100 дзён, пры гэтым харчаваўся толькі марозівам і алкаголем. Здаецца, я знайшла ідэальную дыету.**

— Ты колькі штангу выжымаеш лежачы?
— Кілаграмаў дзвесце.
— Ну нічога ты даеш, а па табе не скажаш.
— Ага, дык гэта ў суме. За тыдзень.

**Жонка сказала, што на вячэру мяне чакае нейкі кулінарны сюрпрыз, зроблены яе ўласнымі рукамі. Таму, на ўсялякі выпадак, купіў пачак пельменяў.**

Сын кажа бацьку:
— Тата, я цябе віншую! Памятаеш, ты абяцаў мне сто баксаў за тое, што я перайду ў пяты клас? Дык вось, ты зэканоміў.

**Як кажа мой дзядуля, калі маю бабулю нешта раз'юшвае, яна п'е сардэчнік на спірце. А раз'юшвае яе тое, што мой дзядуля п'е спірт без сардэчніка.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2927.
Нумар падпісаны ў 19.30 3 жніўня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12